

ШКОЛЬНЫ БУЛІНГ: АДЗІН СУПРАЦЬ УСІХ

ЧЫРВОНКА

НА МАТАЦЫКЛЕ ПА КРАІНАХ І КАНТЫНЕНТАХ

ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 САКАВІКА 2020 г. ЧАЦВЕР № 59 (29173)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Маргарыта ПАЧЫЦКАЯ, начальнік аддзела арэнды жылля агенцтва нерухомасці «Твая сталіца»:**

*«Традыцыйна ў пачатку сакавіка актывізуюцца арандатары загараднага жылля на летні перыяд, але сёлетняй вясной арандатараў стала яшчэ больш. Сёння да кліентаў, якія шукаюць дом на лета для сябе і сваёй сям'і, дадаліся і тыя, хто сур'ёзна разглядае загарад як месца для самаізаляцыі. Летась асаблівага ўсплёску попыту на арэнду загараднай нерухомасці не назіралася. І калі параўнаць першы квартал 2019-га з аналагічным перыядам 2020 года, то можна смела сказаць, што попыт узрос на 30 %».*

# ГАРАЖ ШМАТПРОФІЛЬНАГА ПРЫЗНАЧЭННЯ



**У сталічнага жыхара Андрэя БЕГУНА шмат цікавых захапленняў. Я ведаю яго як апантанага вандроўніка-экстрэмала, які разам з сябрамі ладзіць далёкія шматдзённыя аўтападарожжы на Байкал, Каўказ. Ён аб'ехаў ці не палову суседкі-Расіі. Часта жыццярадасны мінчанін прападае ў гаражы, бо тут у яго створана сапраўдная майстэрня. Андрэй любіць канструяваць новыя механізмы і агрэгаты, яму падабаецца рамантаваць старую тэхніку і бытавыя прыборы, мадэрнізаваць для цяжкадаступных дарог транспарт — пазадарожнікі і звычайныя ровары. Нездарма ж кажуць: не кармі майстра хлебам, а дай папрацаваць!**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- Мінфін гатовы прыняць меры для захавання ўстойлівасці бюджэту на фоне сітуацыі з COVID-19 і цэнамі на нафту.
- **У Лепельскім раёне сабралі зямлю з воінскіх пахаванняў у агульную капсулу.**
- Памерла актрыса Іна Макарава.



- **Кіраўнікі ЕС заклікалі захаваць адкрытымі ўнутраныя граніцы для перамяшчэння тавараў.**
- Белдзяржцырк адмяняе прадстаўленні.

Супрацоўніцтва

# ЯК ВЕДАЛІ...

### Эпідэміі прыходзяць і сыходзяць, а інфекцыяністам заўсёды трэба быць напагатове

**Цяперашняя пандэмія яшчэ раз нагадала і медыкам, і ўладным структурам, і нам усім, як важна супрацоўнічаць дзяржавамі не толькі ў галіне эканомікі, але і ў галіне аховы здароўя. Свет цяпер надзвычай рухомы, людзі перасоўваюцца, а з імі перамяшчаюцца інфекцыі і вірусы, для якіх граніцы не існуюць наогул. Таму вельмі важным бачыцца стан здароўя насельніцтва ў памежжы. А ён залежыць ад многіх фактараў. Сярод іх можна назваць аснашчанасць устаноў аховы здароўя, падрыхтаванасць медыцынскага персаналу, абмен інфармацыяй і шмат іншых.**

Пра асаблівасці дыягностыкі і лячэння гепатыту С, ВІЧ/СНІД, іншых вірусных інфекцый ішла гаворка на семінары-трэнінгу, які правяла Брэсцкая абласная клінічная бальніца ў рамках праграмы беларуска-польскага супрацоўніцтва. Канферэнцыя вызначылася тым, што яе не адмянілі, як многія мерапрыемствы, а правялі ў раней прызначаны дзень. Пры рэгістрацыі ўдзельнікам прапаноўвалі скарыстацца антысептыкам, а крэслы ў зале пасяджэння стаялі не шчыльна, а на пэўнай адлегласці. У астатнім семінар праходзіў як звычайна. Урачы абласной бальніцы дзяліліся ведамі са сваімі калегамі з раённых цэнтраў, гарадскіх бальніц і паліклінік.

СТАР. 2

Жыві і квітней, Беларусь! Наш дом

# ПЛЯЧО ДЛЯ НЯДБАЙНЫХ БАЦЬКОЎ

### Як маладая сям'я гадуе дзяцей у новым доме

**Двухпавярховы асабняк, куды нядаўна засялілася шматлікая сям'я, доўга шукаць не давялося. Па-першае, гэта цэнтр горада, а па-другое, такіх дамоў тут некалькі. Чацвёрты па ліку адкрыты ў канцы мінулага года. А насяляюць яго ажно 10 чалавек — двое бацькоў і васьмёра дзяцей.**



СТАР. 13

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Вы яшчэ паспяваеце падпісацца на «Звязду» на II квартал

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

Грошы

# ПРЫЦІШЫЦЬ АПЕТЫТЫ

## Рэгулятар папрасіў банкі ведаць меру пры продажы насельніцтву наяўнай валюты

**Нацбанк краіны накіраваў на адрас камерцыйных банкаў рэкамендацыі па забеспячэнні якаснага і бесперабойнага абслугоўвання фізічных асоб у сітуацыі павышанага попыту на асобныя банкаўскія аперацыі.**

У прыватнасці, банкам паказана на недапушчальнасць увядзення неабгрунтаваных абмежаванняў і ўзнагароджанняў за здзяйсненне банкаўскіх аперацый, у тым ліку звязаных з атрыманнем наяўных грашовых сродкаў кліентамі са сваіх бягучых (разліковых) банкаўскіх рахункаў (уключаючы рахункі, да якіх выпушчаны ў абарачэнне банкаўскія плацежныя карткі) і правядзеннем безнаяўных разлікаў.

Таксама фінансавым інстытутам рэкамендавана не завышаць курс канверсіі пры зняцці насельніцтвам наяўнай замежнай валюты, якая адрозніваецца ад валюты бягучага банкаўскага рахунку, у тым ліку рахунку па ўліку ўкладу (дэпазіту), а таксама пры пералічэнні замежнай валюты па рахунках, адкрытых у розных замежных валютах.

Акрамя таго, у сённяшніх умовах, якія характарызуюцца адсутнасцю з аб'ектыўных прычын дастатковага аб'ёму наяўных долараў, банкам неабходна падмацоўваць абменныя пункты (касы) іншай наяўнай замежнай валютай у аб'ёмах, дастатковых для поўнага задавальнення попыту насельніцтва.

І галоўнае: Нацыянальны банк таксама звярнуў увагу банкаў на неабходнасць узважанага падыходу да ўстанаўлення розніцы паміж курсамі куплі і продажу замежнай валюты.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Зялёнае багацце

# ВЫСЯКАЮЧЫ, ПРЫБЫВАЦЬ ГЕКТАРАМІ

**Сёлета ў краіне мерапрыемствы па лесааднаўленні і лесаразвядзенні будуць праведзены на плошчы не менш за 36 тысяч гектараў. Пры гэтым плануецца павялічыць плошчы пасеву і пасадкі ліставых парод. Аб гэтым расказаў міністр лясной гаспадаркі Віталь ДРОЖЖА.**

Арганізацыямі Мінлясгаса ў мінулым годзе экспартавана тавараў і паслуг на суму 154 мільёны долараў ці 110 працэнтаў да ўзроўню 2018 года. Больш за 60 працэнтаў з якіх — гэта піламатэрыялы. Яны адпраўляліся ў Літву, Германію, Латвію, Польшчу, Бельгію, Румынію, Кітай і іншыя краіны.

— Летась было забяспечана выкананне ўсіх ключавых паказчыкаў па драўніне. Аб'ём нарыхтоўкі яе з аднаго гектара лясных зямель склаў амаль 3 кубаметры пры плане 2,4, — сказаў міністр.

У 2021 годзе плануецца паэтапна ўкараніць электронную сістэму ўліку драўніны. Адзіную дзяржаўную аўтаматызаваную інфармацыйную сістэму па яе ўліку і здзелках з ёй пачалі распрацоўваць у Беларусі ў 2017 годзе. Мяркуецца, што ёю будуць карыстацца не толькі лягасы, але і перавозчыкі драўнянай сыравіны, а таксама ўсе арганізацыі любой формы ўласнасці, якія займаюцца ляснай гаспадаркай.

Забяспечваецца перавышэнне плошчы стварэння лясоў над іх высечкай. Пры суцэльных высечках 51 тысячы гектараў новыя ўгоддзі з'явіліся больш чым на 70 тысячах гектараў, асноўная частка — больш за 50 тысяч — штучным спосабам. Летась у гадавальніках было вырашчана больш за 402 мільёны адзінак стандартнага пасадачнага матэрыялу, з іх з закрытай каранёвай сістэмай — амаль 23 мільёны. Да таго ж, у мінулым годзе ў два разы былі зменшаны аб'ёмы хворых насаджэнняў у адносінах да папярэдняга года. Сёлета плануецца знізіць гэты паказчык яшчэ ўдвая.

— У краіне працягваецца будаўніцтва шасці пелетных заводаў. Гэта перспектыўны для нас кірунак, прадпрыемствы дазволяць выпускаць каля 150 тысяч тон пелет у год. Каля 70 працэнтаў будаўніча-мантажных работ на чатырох вытворчасцях ужо выкананы. Гэта заводы ў Барысаўскім, Клічаўскім, Пружанскім і Навагрудскім раёнах, — адзначыў Віталь Дрожжа. — Таксама летась быў уведзены ў эксплуатацыю цяплічны лесанасенны комплекс, сёлета плануецца адкрыць яшчэ адзін у Магілёўскай вобласці.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# ЯК ВЕДАЛІ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гэтая канферэнцыя праводзілася ў рамках праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва Польшча—Беларусь—Украіна, якое ажыццяўляецца пры падтрымцы Еўрапейскага саюза з 2013 года. Менавіта сем гадоў таму Брэсцкая абласная бальніца разам са шпіталем з Бяла-Падляскі выйграла грант на праграму паляпшэння кардыялагічнай дапамогі насельніцтву польскага і беларускага пагранічча. Тады ў нашай абласной бальніцы правялі рэканструкцыю аддзялення эндаваскулярнай хірургіі і набылі ангіяграфічны комплекс. Урачы асвоілі новыя метадыкі лячэння перыферычных захворванняў артэрый, сталі на новым узроўні працаваць з сасудамі галаўнога мозга. Усё гэта, несумненна, паспрыяла паляпшэнню якасці медыцынскіх паслуг.





— Наступны кірунак супрацоўніцтва, які мы абралі пасля кансультацый з польскімі калегамі ў 2016 годзе, датычыўся паляпшэння эпідэміялагічнай бяспекі, — расказаў **галоўны ўрач Брэсцкай абласной клінічнай бальніцы Аляксандр КАРПІЦКІ** *(на фота)*. — Праграма разлічана на адрэзак часу, што ўключае 2020 год, яна прадугледжвае набыццё абсталявання для лабараторнай дыягностыкі інфекцыйных захворванняў, а таксама вялікую работу па навучанні медыцынскага персаналу. Вучоба вядзецца асобна з абодвух бакоў граніцы з наступнымі сумеснымі вучэннямі медыкаў. Калі мы выбіралі тэму, мы не маглі прадугледзець цяперашняй пандэміі, выбіралі кірунак па агульнай актуальнасці. А цяпер атрымліваецца, нібы ў ваду глядзелі, — працягвае Аляксандр Сяргеевіч. — Літаральна на гэтым тыдні прагучаем атрымліваць закупленыя па праграме касцюмы шматразовага выкарыстання для медыцынскага персаналу і боксы для транспарціроўкі інфекцыйных хворых.

Пра важнасць праекта для ранняга выяўлення гепатыту С карэспандэнту газеты расказаў загадчык 2-га інфекцыйнага аддзялення Брэсцкай абласной бальніцы, **галоўны пазаштатны інфекцыяніст вобласці Мікалай СУЛЕЎСКІ:**

— Вірусны гепатыт С паранейшаму з'яўляецца вялікай праблемай. І калі ў апошні час колькасць захворванняў у вострай форме крыху памяншаецца, то нязменна расце колькасць хранічных формаў гэтай паталогіі. Па праграме супрацоўніцтва мы ўжо атрымалі тэст-сістэмы для выяўлення гепатыту С, таксама набылі апарат для вызначэння ступені фіброзу печані. Важна адразу выявіць, на якой стадыі хвароба, каб мы не страцілі час ад выяўлення праблемы ў пацыента да моманту прызначэння тэрапіі, бо наша максімальная задача заключаецца ў тым, каб не дапусціць развіцця цырозу і яго ўскладнення.

Па гэтай праграме будзе абследавана больш за 3000 грамадзян. Ужо прайшлі тэсты 498 чалавек, у 22 з іх дыягнаставаны гепатыт С. Гэта значыць, чалавек жыў і нават не падазраваў, што мае ў арганізме такую інфекцыю і з'яўляецца яе носьбітам.

Мікалай Іванавіч таксама звярнуў увагу на адказнасць кожнага чалавека за сваё здароўе. У гэтым кантэксце ён прывёў прыклад, калі гепатыт выявілі ў кліенткі прыватнага майстра манікюру. Цяпер многія ажыццяўляюць паслугі цырульніка, робяць манікюр, педыкюр дома, без рэгістрацыі, без патэнцыйных праверак з боку санітарных службаў. Таму кожны павінен выбіраць, дзе абслугоўвацца: у афіцыйнай установе, дзе даражэй, ці нелегальна — танней, але без усякіх гарантый бяспекі.

Не магла не скарыстаць нагоду і не спытаць пра каранавірус: у інфекцыйным аддзяленні шпіталізаваны людзі з групы рызыкі, якія прыехалі з-за мяжы альбо кантактавалі з хворымі.

— На сённяшні дзень (20 сакавіка. — **Аўт.**) фактаў каранавіруса ў Брэсцкай вобласці зарэгістравана не было, — паведаміў загадчык аддзялення. — Хачу папрасіць, каб людзі не паддаваліся паніцы, да таго ж вельмі адказна і асцярожна ставіліся да інфармацыі, якую распаўсюджваюць: яна можа нашкодзіць часам не менш за няправільнае лячэнне.

На канферэнцыі размова ішла пра яшчэ адну каварную інфекцыю сучаснасці — ВІЧ-інфекцыю. **Загадчыца кабінета кансультацыі і дыспансерызацыі хворых на ВІЧ/СНІД абласной бальніцы Людміла КАСЦЮКЕВІЧ** адзначыла, што ў 25 працэнтаў выпадкаў ВІЧ спалучаецца з гепатытам С:

— Нашы пацыенты атрымліваюць лячэнне ад гепатыту ў прыярытэтным парадку. Важнасць праграмы, пра якую ідзе гаворка, вядома, у своечасовым выяўленні інфекцыі, не меншая важнасць і ў асветніцкай рабоце. Сёння, напрыклад, я гаварыла з калегамі пра тое, як агульнымі намаганнямі дасягнуць пастаяннага стану заклапочанасці і насцярожанасці. Вы, мабыць, заўважалі, што, тэматыка ВІЧ у СМІ, у грамадстве агучваецца ў выглядзе кампаній. Скажам, 1 снежня, а таксама ў дзень памяці ахвяр СНІДу пра каварную хваробу гавораць актыўна, потым інфармацыйная хваля сціхае. Страчваюць насцярожанасць не толькі, умоўна кажучы, абывацелі, але нават медыкі, якія, здараецца, своечасова не накіроўваюць людзей з групы рызыкі на абследаванне. У выніку да нас трапляе чалавек на апошніх стадыях хваробы, якому ўжо немагчыма дапамагчы. Летась такіх было 18 працэнтаў ад агульнай колькасці.

Яшчэ суразмоўніца засяродзіла ўвагу на тым, што з выяўленых летась ВІЧ-станоўчых пацыентаў 86 працэнтаў атрымалі вірус пры палавых кантактах. «Так што мараль па-ранейшаму мае значэнне для грамадства ў цэлым і кожнага чалавека ў прыватнасці. Бо заразіцца пры беспарадкавых альбо выпадковых сувязях можна не толькі ВІЧ, але і фактычна любой інфекцыяй», — падсумавала Людміла Баляславаўна.

Работа па праграме супрацоўніцтва працягваецца. У найбліжэйшы час запланаваны семінар-вучоба для медсясцёр, за ім другія мерапрыемствы.

— Хачу падкрэсліць канструктыўнасць нашага супрацоўніцтва з польскімі калегамі, — заўважыў **галоўны ўрач Брэсцкай абласной бальніцы, член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Аляксандр КАРПІЦКІ.** — Напрыклад, пры вызначэнні аб'ёмаў фінансавання менавіта нашы калегі пераканалі ўласнае ведамства аховы здароўя, што нам неабходная большая частка выдзеленых грошай. І мы яе атрымалі. Цяпер сродкі паспяхова асвойваюцца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ЗША выдаткуюць на аднаўленне эканомікі два трыльёны долараў

Дырэктар па заканадаўчых пытаннях Белага дома Эрык Уэланд заявіў, што адміністрацыя прэзідэнта ЗША Дональда Трампа і сенатары-дэмакраты змаглі дамовіцца па законапраекце аб экстраннай дапамозе амерыканскай эканоміцы і грамадзянам. Аб'ём укладанняў — $2 трлн. Раней паведамлялася, што законапраект, які абмяркоўвалі Белы дом і Сенат, прадугледжвае грашовыя выплаты ў памеры $1200 мноству амерыканцаў, стварэнне праграмы падтрымкі малога бізнесу аб'ёмам $367 млрд, а таксама выдзяленне $500 млрд для фінансавання розных галін эканомікі, падтрымкі гарадоў і штатаў.

## Золата паказала максімальны рост



Золата падаражэла на шэсць працэнтаў. Гэта самы значны рост цаны на каштоўны метал за адзін дзень з 2009 года. У грашовым выражэнні павелічэнне кошту аказалася самае вялікае за ўсю гісторыю назіранняў. Цана ўзрасла на $93,2 і дасягнула $1660,8 за унцыю. На рэкордны рост паўплывалі закрыццё золатаздабыўных заводаў і дзеянні Федэральнай рэзервовай сістэмы ЗША па барацьбе з наступствамі каранавіруса, адзначыў MarketWatch. ФРС абвясціла аб праграме неабмежаванай скупкі дзяржаблігацый і іпатэчных папер агенцтваў. «Гэта азначае сістэматычнае знішчэнне долара, што, відавочна, ідзе на карысць патэнцыялу золата», — адзначыў кіраўнік даследаванняў біржавога інвестыцыйнага фонду GraniteShares Раян Джанота. Адначасова тры найбуйнейшыя золатаздабыўныя заводы Valcambi, Argor-Heraeus і PAMP паведамілі аб прыпыненні вытворчасці ў Швейцарыі сама меней меры на тыдзень, паведаміла Reuters.

## Польшча пабудуе АЭС

Польшча па-ранейшаму адна з нямногіх еўрапейскіх краін, дзе няма ніводнага ядзернага рэактара. Але цяпер усё змяніцца, перадае Euronews. Кошт будаўніцтва новага энергааб'екта цяжка ацаніць, застаецца яшчэ вельмі шмат пытанняў, але, паводле папярэдніх ацэнак урада, на яго мяркуюць выдаткаваць каля 25—30 мільярдаў еўра. «Я думаю, што мы можам чакаць гэтых рашэнняў ужо сёлета», — заявіў прадстаўнік урада Польшчы Пётр Мюлер. Улады зыходзяць з таго, што ядзерная энергетыка будзе складаць 20 працэнтаў польскага энергабалансу. Гаворка вядзецца пра 6—9 гігават атамнай энергіі, а гэта будзе азначаць, што мяркуецца пабудаваць шэсць рэактараў у розных частках Польшчы.

На слыху

# Уладзімір КАРАНІК: «У НАС ІНШЫ, ЧЫМ У ІТАЛІІ, СЦЭНАРЫЙ»

## Спецыялісты расказалі пра імавернасць каранціну, запас прэпаратаў і сцэнарыі развіцця эпідэміі COVID-19

**Учора міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК адказаў на пытанні студэнтаў аб сітуацыі з COVID-19 у Беларусі ў межах анлайн-трансляцыі. Яму дапамагалі начальнік галоўнага ўпраўлення вышэйшай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ і намеснік галоўнага ўрача інфекцыйнай бальніцы Мінска Алег СКРЫПКО. Маладых людзей цікавілі самыя розныя пытанні: ад увядзення каранціну ў навучальных установах да запасу лекавых прэпаратаў і ложкавага фонду, а таксама магчымасць развіцця сітуацыі з каранавірусам у Беларусі па італьянскім сцэнарыі.**

Спачатку Уладзімір Каранік акрэсліў агульную сітуацыю з каранавірусам. На ўчарашні дзень у Беларусі зафіксавана 86 выпадкаў заражэння. У 29 пацыентаў пасля назірання і лячэння ад аднаго да трох тэстаў далі адмоўныя вынікі, у залежнасці ад гэтага яны або выпісаны, або рыхтуюцца да выпіскі. Медыцынскі кантроль і лячэнне 59 пацыентаў працягваюцца. З моманту першага выпадку каранавіруса ў Беларусі выяўлена 1200 кантактаў першага ўзроўню, людзі таксама былі шпіталізаваны. Частка з іх выпісана, астатнія працягваюць знаходзіцца пад медыцынскім назіраннем.

— Каранавірусы вядомы медыцыне з пачатку 60-х гадоў, сярод людзей яны цыркулююць даўно, і большасць з іх выклікаюць лёгкую прастуду. Здараліся ўспышкі каранавірусаў SARS і MERS, апошні быў асабліва небяспечны і выклікаў да 30 % смяротнасці. У выніку SARS зайшоў у эпідэмічны тупік і больш не рэгіструецца, а MERS выклікае адзінкавыя ўспышкі, — пачаў знаёміць з сітуацыяй Уладзімір Каранік. — COVID-19 можа працякаць у лёгкай форме — ад 81 % да 85 % інфіцыраваных пераносяць яго на нагах і не маюць патрэбы ў медыцынскай дапамозе, 10—14 % патрабуецца медыцынская дапамога, 5-6 % маюць патрэбу ў інтэнсіўнай тэрапіі, у тым ліку ў рэспіраторнай падтрымцы. Заўсёды палохае штосьці невядомае, тым больш што гэта першая эпідэмія ва ўмовах інфармацыйнай адкрытасці і вялікай колькасці людзей з жаданнем «хайпануць».

Кожная краіна выбірае сваю стратэгію. Мы выпрацавалі просты падыход: не дапусціць росту ліку пацыентаў, калі іх колькасць перавысіць магчымасці нашай сістэмы аховы здароўя. Мы праводзім мерапрыемствы па перыметры краіны: вымярэнне тэмпературы цела ў тых, хто прыбывае з-за мяжы. Яно праводзіцца ў плыні людзей стацыянарным цеплавізарам, больш падобным да відэакамеры. Больш за 250 чалавек выяўлена такім чынам з прыкметамі вострай рэспіраторнай інфекцыі. Пры выяўленні станоўчага тэсту на каранавірус вызначаем кантакты першага ўзроўню: працуюць у адным кабінеце, ехалі ў адной машыне. І таксама іх ізалюем. Гэта дазваляе стрымліваць распаўсюджванне COVID-19. Прывяду прыклад: дзяўчына вярнулася з-за мяжы, вырашыла наведаць начны клуб, мы потым разам з супрацоўнікамі міліцыі прагледзелі запісы камер відэаназірання, каб высветліць усе яе кантакты.

Альтэрнатыва тым мерапрыемствам, якія праводзім мы, выкарыстоўваецца ў краінах, дзе няма санітарна-эпідэміялагічнай службы, — гэта меры раз'яднання насельніцтва, а менавіта каранцін. Але для поўнай эфектыўнасці ён павінен дзейнічаць 12-13 тыдняў. Якая краіна гэта вытрымае? ЗША і Бразілія ўжо пайшлі на паслабленне гэтых мерапрыемстваў.

У нас у краіне больш за 70 тысяч ложкаў. 86 хворых і 1200 кантактаў першага ўзроўню не могуць стварыць перагрузкі сістэмы аховы здароўя. Хочацца застацца на такім узроўні.

***— Ці будзе каранцін ва ўніверсітэтах?*** — такое было першае пытанне са студэнцкага асяроддзя.

**С. К.** — Пытанне ўвядзення каранціну Міністэрства адукацыі лічыць неактуальным. Увесь комплекс прафілактычных мер, у прыватнасці, адмена і перанос масавых мерапрыемстваў, карэкціроўка графіка вучэбных заняткаў, праведзены.

**У. К.** — У нас быў не зусім пазітыўны вопыт пераводу на дыстанцыйнае навучанне студэнтаў БНТУ, якіх мы прасілі не пакідаць Мінск. У той жа дзень каля 600 чалавек паехалі па гарадах і вёсках. Больш за 100 былі шпіталізаваны ў розныя медыцынскія ўстановы па ўсёй краіне з прыкметамі вострых рэспіраторных інфекцый, і мы ўсіх правяралі на COVID-19, праўда, ні ў кога ён не пацвердзіўся. Потым пісалі нам гнеўныя пісьмы: чаму вынікаў тэсту другі дзень няма? Таму што лабараторыі знаходзяцца ў Мінску і тэст трэба туды адвезці...

***— Чаму пры выяўленні новых выпадкаў каранавіруса вы не называеце гарады, у якіх гэта адбылося? Магчыма, гэта трэба рабіць, каб іх жыхары былі больш асцярожнымі?***

**У. К.** — Спрабавалі спачатку называць, але блогеры і журналісты пачыналі ўмешвацца ў жыццё гэтых грамадзян. Высвятлялі, як функцыянуюць прадпрыемствы, дзе працавалі гэтыя пацыенты. У выніку людзі сталі пазней звяртацца па медыцынскую дапамогу, расказваць не пра ўсе кантакты. Больш асцярожнымі трэба быць усім, тым больш што мы знаходзімся на піку сезоннага пад'ёму захворванняў.

***— Ці бяспечна цяпер наведваць студэнцкую сталоўку, бібліятэку?***

**А. С.** — Калі ўсе паверхні апрацоўваюцца, што цяпер і робіцца, то рызыкі няма. У бібліятэцы, калі вы гартаеце кнігу, слінявячы пальцы,



**Сацыяльныя службы Лепельшчыны дастаўляюць адзінокім пажылым людзям і інвалідам прадукты і лекі на дом. Сацыяльны работнік Вольга КРАЎЧАНКА перадае прадукты пенсіянерцы з вёсцы Бароўка Маргарыце ВАСІЛЕНКА.**

Фота БелТА.

імавернасць ёсць. Правіла адно: пры кантакце з любымі паверхнямі мыць рукі.

**У. К.** — З ЗША дайшоў ролік, дзе медыцынскім работнікам расказваюць пра меры бяспекі — нашэнне масак і іншае, а выступоўца слінявіць пальцы, перагортваючы старонкі. Гэта выклікала вялікі сарказм у медыцынскім асяроддзі.

***— Ці можа абараніць марлевая павязка?***

**А. С.** — Марлевая павязка з прычыны сваёй структуры не абараніць ад віруса. У ёй вялікага сэнсу няма. Ёсць сэнс у захоўванні адлегласці 1—1,5 метра ад іншых людзей і асабістай гігіене.

***— Ці дастаткова ў нас супрацьвірусных прэпаратаў і ці хопіць апаратаў штучнай вентыляцыі лёгкіх?***

**У. К.** — Этыятропнага лячэння ад каранавіруса няма. Асельтамівір мы ўключаем у схему лячэння, калі бачым, што, акрамя каранавіруса, у пацыента ёсць грып. Антырэтравірусная тэрапія для лячэння ВІЧ, якая таксама выкарыстоўваецца, маецца з вялікім запасам і ў нашай краіне вырабляецца. Рэзервы сродкаў для лячэння пнеўманіі таксама створаны, мы іх не толькі вырабляем, але і экспартуем. Мы робім усё магчымае, каб апараты штучнай вентыляцыі лёгкіх не спатрэбіліся ў максімальнай колькасці. Ёсць лічбы, што ў ЗША на 100 тысяч насельніцтва прыпадае 12,9 апаратаў, у Італіі 8,8. У нас, калі лічыць усю наркозна-дыхальную апаратуру, — 38, толькі апаратаў штучнай вентыляцыі — больш за 25 на 100 тысяч.

***— Ці праўда, што каранавірус гіне пры высокай тэмпературы?***

**А. С.** — Любыя вірусы гінуць пры высокай тэмпературы. Але ці знікне ўспышка з надыходам цяпла, мы пакуль не ведаем. Спадзяёмся, што сезонныя асаблівасці каранавіруса будуць падобнымі на грып.

***— Чым скончыцца ўспышка каранавіруса?***

**У. К.** — Чым заканчваюцца ўсе ўспышкі? Тым, што вірус траціць вірулентнасць (агрэсіўнасць да арганізма гаспадара. — **«Зв.»**) і мяняецца. Застаецца той, што пераносіцца ў лёгкай форме. Утвараецца вялікая праслойка тых, хто або неўспрымальны да яго, або тых, хто перанёс і мае імунітэт. Хутчэй за ўсё, ён стане менш вірулентны, будзе цыркуляваць разам з грыпам, ператварыўшыся ў сезонную хваробу. У структуры рэспіраторных інфекцый каранавірусы займаюць 14 %, магчыма, COVID-19 стане адным з іх.

***— Самы пік захваральнасці ў Беларусі чакаецца ў сярэдзіне красавіка?***

**У. К.** — Называлася шмат розных дат, апошняя — у мінулую пятніцу. Спадзяёмся, што ўспышкі не адбудзецца.

***— Жанчына з Жыткавіч сапраўды хворая на каранавірус?***

**У. К.** — Ёсць тры віды тэст-сістэм, якімі мы правяраем пацыентаў. Калі адна з іх дае станоўчы вынік, пачынаем супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы і паралельна тэсціруем іншымі тэст-сістэмамі. І толькі пасля гэтага кажам: так. Што датычыцца жыхаркі Жыткавіч, ёсць разнагалоссі па тэстах. У двух з іх дыягназ удакладняецца.

***— Ці плануецца рассяляць студэнцкія інтэрнаты?***

**У. К.** — У рамках супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў пакуль не. А вось падтрымліваць там парадак і прытрымлівацца правіл трэба. Ведаеце, калі ў нас было выяўлена больш за ўсё кантактаў? Пасля вечарынкі ў студэнцкім інтэрнаце. Добра, што ўсе яны адмоўныя.

***— Ёсць лёгкая і цяжкая разнавіднасць COVID-19, ці гэта розныя людзі яго па-рознаму пераносяць?***

**А. С.** — Чым меншы ўзрост, тым лягчэй вы пераносіце хваробу. Людзі прыкладна да 50 гадоў пераносяць яго лёгка. У пацыентаў за 50 больш значныя праявы, пнеўманія. Самаму ўзроставаму нашаму пацыенту 79 гадоў, ён з'ездзіў у Маскву на сустрэчу з сябрамі, цяпер праходзіць лячэнне.

***— Чаму не закрываюцца рэлігійныя ўстановы?***

**У. К.** — У нас царква аддзелена ад дзяржавы. Я падпісаў пісьмо на адрас духавенства, дзе ёсць рэкамендацыі пазбягаць цалавання ікон, крыжоў. І атрымаў адказ ад кіраўніцтва і каталіцкай, і праваслаўнай царквы, што інфармацыю распаўсюдзілі, у тым ліку і парады ўстрымацца на велікодныя святы ад цалавання святынь, захоўваць дыстанцыю паміж людзьмі, праверыць вентыляцыю і іншае.

***— Сістэме аховы здароўя чагосьці не хапае, што быў адкрыты дабрачынны рахунак?***

**У. К.** — Нас тыдзень бамбілі: адкрыйце рахунак, хочам дапамагчы. Калі ёсць запыт адчуць прыналежнасць — калі ласка. Гэта элемент кансалідацыі грамадства, бізнесу. Фінансаванне адбываецца ў поўным аб'ёме, мы атрымліваем усё, што неабходна. Не хапае іншага — дзесьці кансалідацыі грамадства, адказных паводзін і адэкватнай рэакцыі.

***— Ці можна паўторна заразіцца COVID-19? Пісалі пра выпадак кітайскага студэнта, які двойчы захварэў і памёр...***

**У. К.** — На думку медыцынскай супольнасці, у Кітаі напачатку было шмат ілжывастаноўчых тэстаў. Ёсць імавернасць, што першы раз у яго быў не каранавірус. Эксперты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя лічаць, што імунітэт пры COVID-19 фарміруецца, яго стойкасць вымяраецца месяцамі.

***— Колькі займае лячэнне маладых людзей ад COVID-19?***

**А. С.** — Калі няма «клінікі», а толькі два дні павышаная тэмпература, то на трэці дзень такі пацыент здаровы. Але мы не можам яго выпісаць. Павінна быць назіранне цягам 14 дзён і два адмоўныя мазкі цягам сутак. Толькі пры выкананні гэтых двух крытэрыяў мы выпісваем.

***— У распаўсюджванні каранавіруса мы ідзём па італьянскім сцэнарыі?***

**У. К.** — У нас ён іншы. У Еўропе няма санітарна-эпідэміялагічнай службы, інфекцыйных бальніц. У Італіі першае заражэнне адбылося ў пажылога, але вельмі актыўнага пацыента. Ён трапіў у звычайную бальніцу, дзе толькі на шосты ці дзявяты дзень яго тыпіравалі на COVID-19. За гэты час заразіліся і медперсанал, і іншыя пацыенты. У нас прадугледжаны перапрафіляванне бальніц і раздзяленне плыняў пацыентаў.

***— Ці дапускаецца магчымасць каранціну, калі сітуацыя выйдзе з-пад кантролю?***

**У. К.** — Каранцін — гэта часовая мера, каб даць перадышку сістэме аховы здароўя. Мы робім усё, каб колькасць пацыентаў істотна не расла і сітуацыя не развівалася па негатыўным сцэнарыі. У адваротным выпадку, паверце, мы ведаем, што рабіць і якія меры прымаць — нас гэтаму вучылі ў медінстытутах.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Школьныя лагеры — пад санітарным наглядам

**Вясеннія канікулы распачнуцца ў беларускіх школах 30 сакавіка.**

Як паведаміла прэс-служба Міністэрства адукацыі, падчас школьных канікул ва ўстановах адукацыі будуць працаваць дзіцячыя лагеры, і, каб дзіця было пад наглядам, бацькі могуць падаць заявы ў лагер ва ўстаноўленым парадку.

Праграма знаходжання распрацоўваецца індывідуальна ў кожнай навучальнай установе з улікам усіх санітарна-прафілактычных мерапрыемстваў і рэкамендацый санэпідслужбы і Міністэрства аховы здароўя.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# МАСКІ СКІНУТЫ

## Праз прагнасць скарыстаўся сітуацыяй

**29-гадовы жыхар Гродна незаконна рэалізоўваў медыцынскія маскі, пальчаткі і дэзсродкі. Улічваючы цяперашні попыт на названыя сродкі індывідуальнай абароны, ён вырашыў падзарабіць на сітуацыі. У аптэках мужчына набыў медыцынскія тавары ў немалой колькасці. Пакупнікоў знаходзіў праз інтэрнэт. Пры гэтым і цану тавару прадпрымальны гродзенец значна павялічваў.**

Падчас спробы продажу 200 масак, некалькіх скрынак пальчатак і дэзынфіцыруючага сродку мужчыну затрымалі аператыўнікі па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі. Як паведамляе УУС Гродзенскага аблвыканкама, агулам у яго канфіскавана 830 медыцынскіх масак, 1500 пальчатак і дэзынфектар. Легальны кошт тавару ацэньваецца ў 826 рублёў, але прыбытак ад рэалізацыі медыцынскіх тавараў малады чалавек меў намер атрымаць значна большы.

У дачыненні да мужчыны складзены адміністрацыйны пратакол за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць. Санкцыя гэтага артыкула прадугледжвае штраф у памеры да ста базавых велічынь.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Спажывец

# СУТКІ БЫВАЮЦЬ РОЗНЫЯ

## Гамяльчанка падала іск у суд на мінскі гатэль і выйграла справу

**У Таццяны Сіроткінай з Гомеля цяпер з'явілася, магчыма, самае дзіўнае хобі для беларускі: яна калекцыянуе інфармацыйныя лісты з правіламі аказання паслуг у айчынных гасцініцах. Вывучаць кожную літару і лічбу ў дакументах яе, кажа, лёс прымусіў. Тры месяцы таму гамяльчанка прыйшла ў суд з іскам аб абароне правоў спажыўца. Яна запэўнівала, што ў дачыненні да яе закон парушыў адзін са сталічных гатэляў.**



На сваім прыкладзе жанчына цвёрда вырашыла даказаць: што некаторыя гасцініцы ў сваіх інтарэсах карыстаюцца тым, што не ўсе пастаяльцы ведаюць артыкулы закона аб вядзенні гасцінічнай гаспадаркі ў Беларусі. Хтосьці трактуе артыкулы закона як разумее, хтосьці прапісвае няпоўную ці скажоную інфармацыю ў прэйскурантах паслуг.

— Я амаль кожнае лета падарожнічала па Беларусі, — расказвае Таццяна Сіроткіна. — Часта спынялася ў гасцініцах, каб пераначаваць. Была ў Лунінцы, напрыклад. Пасля апоўначы стала вызвольваць свабодны нумар, сказалі, што цана — 72 рублі, але, маўляў, не хвалюйцеся, калі вы да раніцы, то гэта палова сутак і заплаціць трэба толькі 50 %. Тая ж гісторыя ў Драгічыне, Баранавічах. У Мсціславе, напрыклад, прыехала ў гасцініцу а палове дванаццатай ночы, на рэсепшане дзяўчына сказала, што месцы ёсць, калі пагуляеце да нуля гадзін, то потым да раніцы выйдзе толькі палова кошту.

Гамяльчанка кажа: яна літаральна на памяць вывучыла адпаведную пастанову Саўміна, у якой гаворыцца аб аплаце разліковай гадзіны, што адлічваецца з 12 гадзін бягучых сутак. Але часам у гасцініцах усё ж такі даводзілася аспрэчваць выстаўлены кошт і спасылацца на літару закона.

— За час падарожжаў па краіне ў мяне з'явілася свая класіфікацыя гасцініц: першыя працуюць адкрыта, другія працуюць таксама вельмі добра, але артыкул закона, які пакідае магчымасць аплаты няпоўных сутак, не афішуюць, калі вы ведаеце — добра, а не — дык заплаціце па поўным кошце. З трэцяй катэгорыяй я сутыкнулася летась у Мінску.

У гасцініцы Заслаўя, куды прыехала Таццяна, не знайшлося месцаў, таму яна патэлефанавала ў мінскі гатэль, дзе забраніравала нумар. Дабралася ў пачатку першай ночы.

— Дзяўчына за стойкай прабіла мне квіток, вяртае пашпарт і кажа: «З вас 61 рубель 20 капеек». Я кажу, што толькі да раніцы — заплачу 50 % кошту за суткі. Атрымліваю адказ: «У нас так ніхто не аплачвае». Вось менавіта гэтая фраза для іх, як высветлілася потым у судзе, — жалезны аргумент. Я спрачалася з супрацоўніцай, прасіла паказаць нарматыўныя дакументы і правілы разліку, на якія яны спасылаюцца, прапаноўвала ноччу патэлефанаваць кіраўніцтву. Нічога не выйшла. Я заплаціла, пайшла ў нумар і вырашыла разабрацца раніцай, калі будзе на месцы начальнік. Ноччу так і не заснула, а раніцай ужо іншая дзяўчына без бэйджыка, якая не прадставілася, але пазіцыянавала сябе як кіраўніцтва, стала мяне запэўніваць, што закон я тлумачу няправільна.

Гамяльчанка вярнулася дадому, напісала скаргу кіраўніцтву адкрытага акцыянернага таварыства, якое валодае гатэлем. Адказ падштурхнуў жанчыну да больш рашучых дзеянняў. Яна напісала афіцыйную прэтэнзію на адрас гатэля з просьбай скасаваць дагавор на аказанне паслуг, вярнуць плату за нумар, унесеную раней, плюс заплаціць тысячу рублёў маральнай кампенсацыі. У гэтых патрабаваннях кіраўніцтва гатэля адмовіла. Тады жанчына пайшла ў гомельскую гарадскую арганізацыю ГА «Беларускае таварыства абароны спажыўцоў», якая і звярнулася ў суд з іскам у інтарэсах жыхаркі Гомеля. Таццяна Міхайлаўна прызнаецца: спачатку не там адгаворвалі ад «судовых разборак» і папярэдзілі, што ў практыцы падобныя справы ніколі не разбіраліся.

— Пры заключэнні дагавора спажыўцу не была дадзена магчымасць неадкладна атрымаць у месцы аказання паслугі неабходную і дакладную інфармацыю аб кошце пражывання ў гасцініцы, — сцвярджае Андрэй Бабіч, юрыст, які выступаў у абарону правоў спажыўца. — Акрамя гэтага, выканаўца паслугі не паведаміў спажыўцу неабходныя звесткі аб правілах і ўмовах эфектыўнага і бяспечнага карыстання нумарам.

Падчас судовых пасяджэнняў юрыст і спажывец спасылаліся на невыкананне гатэлем артыкула № 17 пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 471 ад 07.04.2006 года «Аб зацвярджэнні Правіл гасцінічнага абслугоўвання ў Рэспубліцы Беларусь». Згодна з гэтым дакументам, плата за пражыванне спаганяецца ў адпаведнасці з адзінай разліковай гадзінай: з 12 гадзін бягучых сутак. Пры размяшчэнні да разліковай гадзіны (з 0 да 12 гадзін) плата бярэцца за палову сутак.

— Юрыст гатэля спасылалася на ўнутраныя правілы разліку, — згадвае спажывец. — Цікава, што ў іх таксама агучваецца спасылка на тую ж пастанову Саўміна, але слова «аплата» заменена на «даплата».

Вядома, што юрыст, якая прадстаўляе інтарэсы гатэля, звярнулася да суда з просьбай хадайніцтва ў Саўмін для тлумачэння артыкула закона. Але гамяльчанка скарысталася сваім правам і не дала згоду на гэта. Яна матывавала адмову тым, што з 2006 года, калі пастанова была прынята, у гасцініцы была магчымасць паглыбіцца ў нюансы.

Між тым суд Савецкага раёна Гомеля вынес рашэнне: прызнаць іскавыя патрабаванні абгрунтаванымі. Ён пастанавіў скасаваць дагавор на аказанне паслуг па пражыванні ў гасцініцы, вярнуць спажыўцу суму за нумар і выплаціць гамяльчанцы маральную кампенсацыю ў памеры 30 рублёў. Таварыству абароны спажыўцоў ААТ павінна кампенсаваць судовыя выдаткі. Акрамя таго, гасцініца выплаціць дзяржпошліну — амаль сто рублёў. Каб апратэставаць рашэнне суда, адказчыку было дадзена 15 дзён. Яно сёння ўступіла ў сілу.

— Я задаволена рашэннем суда, — каментуе сітуацыю гамяльчанка, якая выйграла справу, — для яе гэта была прынцыповая пазіцыя. — Але цяпер я таксама планую напісаць заяву ў пракуратуру з просьбай праверыць: па-першае — ці зменіцца сітуацыя з аплатай у гэтым гатэлі, а па-другое — ці дастаткова адказна падыходзяць да выканання закона ў іншых гасцініцах.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

### У тэму

**Юрыст Гомельскай гарадской арганізацыі ГА «Беларускае таварыства абароны спажыўцоў» Андрэй БАБІЧ:**

— Норма права артыкула Закона аб абароне правоў спажыўцоў дзейнічае безумоўна, незалежна ад таго, дарагі гэта тавар, паслуга па рамонце ці продаж нумароў у гасцініцы. Закон адзін для ўсіх: калі ты прадавец, будзь добры, раскажы спажыўцу ўсю інфармацыю пра свой тавар або паслугу. Калі ўнутраныя правілы разліку супярэчаць закону, значыць, трэба пераглядаць правілы гатэля. Упершыню наша арганізацыя прадстаўляла інтарэсы спажыўца ў судзе па падобным іску. Гэта, безумоўна, рэзанансная для нас справа. Але, карыстаючыся магчымасцю, хацелася б папярэдзіць спажыўцоў быць вельмі пільнымі пры заказах мэблі на сайтах прыватных майстэрняў. За апошні час у нашу арганізацыю паступілі дзясяткі зваротаў ад гамяльчан, якія аплацілі аванс ці поўны кошт корпуснай мэблі, кухонных фасадаў і дзвярных палотнаў, але так і не дачакаліся выканання заказаў. Справа ў тым, што з-за росту цаны на матэрыялы ў доларавым эквіваленце некаторыя прадпрымальнікі вырашаюць: прасцей абанкруціцца, чым выканаць заказы сваіх пакупнікоў.

### «Звязда» спытала

Я вырашыла зымітаваць сітуацыю, у якой апынулася гамяльчанка, і адправілася ў адмысловую «тэлефонную» вандроўку па Беларусі.

Гудок, прывітанне супрацоўніка гатэля і пытанне.

— Засяляюся ноччу, пасля нуля гадзін, і застануся да раніцы...

Нават, не дачакаўшыся фіналу звароту, у трубцы папярэджвалі ветлівым тонам:

— Вам усё роўна давядзецца заплаціць за кошт сутак.

Так адказалі ва ўсіх буйных гасцініцах абласных цэнтраў. Але ёсць нюансы.

**Гомель.** «Мы, на жаль, па-іншаму не разлічваем, але калі будзеце пражываць меней за 12 гадзін, то за нумар у пэўным цэнавым сегменце атрымаеце зніжку 15 %, выйдзе каля 38 рублёў».

**Гродна.** «Нават калі застанецеся ў нумары на пяць хвілін! Але дзейнічаюць зніжкі, аднаспальны звычайны нумар атрымаецца 41 рубель».

— Аплачваць у любым выпадку давядзецца як за поўныя суткі, — безапеляцыйна зацвердзілі ў цэнтральных гатэлях **Магілёва** і **Мінска**. **Брэст** паўтарыў адказ папярэднікаў, але прагучала так: «Калі вы заселіцеся апоўначы, то аплачваеце сутачны кошт, у нас гэта значыць 24 гадзіны з часу засялення. Потым апоўначы можна будзе працягнуць знаходжанне да раніцы ўжо за палову кошту за суткі». Сума за аднамесны нумар на 24 гадзіны — ад 47 рублёў. Пры гэтым у **Гомелі**, напрыклад, заначаваць можна ў «кватэры на суткі». Высветлілася, што ў буйных сэрвісах падобных паслуг у начны час кватэра таннее на 20 %, але за начлег таксама давядзецца заплаціць поўны сутачны кошт — ад 30 рублёў.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ

## НАЙЛЕПШЫ ПА ПРАФЕСІІ

### У Магілёве выбралі настаўніка года — 2020

**Андрэй Бязлепкін, настаўнік фізічнай культуры і здароўя ліцэя пры магілёўскім Беларуска-Расійскім універсітэце, стаў пераможцам трэцяга этапу конкурсу прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь» і прызнаны найлепшым настаўнікам Магілёўскай вобласці.**

У фінале конкурсу, які праводзіўся галоўным упраўленнем адукацыі аблвыканкама сумесна з дзяржаўным абласным інстытутам развіцця адукацыі, удзельнічалі 40 чалавек з ліку настаўнікаў і работнікаў устаноў дашкольнай адукацыі з усёй вобласці. Яны дзяліліся вопытам сваёй работы, дэманстравалі на практыцы валоданне сучаснымі сродкамі навучання, праводзілі адкрытыя ўрокі ў незнаёмых класах, дэманстравалі калегам майстар-класы. Журы ацэньвала як прафесійныя, так і творчыя здольнасці педагогаў. У кожнай з васьмі намінацый — настаўнік года па адпаведным вучэбным прадмеце і выхавальнік дашкольнай адукацыі — вызначыліся пераможцы і лаўрэаты. Пераможцы-прадметнікі, у тым ліку і абсалютны пераможца конкурсу Андрэй Бязлепкін, будуць прадстаўляць Магілёўскую вобласць на рэспубліканскім этапе.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## ГЛУПСТВА Ў РАСТЭРМІНОЎКУ

### Лёгкі заробак атрымаўся толькі ў махляра

**Праваахоўнікі Фрунзенскага РУУС сталіцы затрымалі маладога ашуканца, які падманам браў у людзей грошы і гаджэты. Падрабязнасці гэтай гісторыі паведаміла ГУУС Мінгарвыканкама.**

Пачынаючы з 2018 года 23-гадовы непрацуючы жыхар сталіцы, выкарыстоўваючы сацыяльныя сеткі, запрашаў усіх ахвотных атрымаць хуткі прыбытак. Прадстаўляючыся спецыялістам па продажы гаджэтаў і аксесуараў да іх, падазраваны прапаноўваў маладым людзям аформіць на сябе растэрміноўку на набыццё таго ці іншага мабільнага тэлефона альбо навушнікаў, а пасля перадаць іх яму для перапродажу. Растэрміноўку, узятую на набыццё тавараў, 23-гадовы мінчанін абяцаў выплачваць самастойна. У якасці аплаты за «дапамогу» хлопец прапаноўваў ад 90 да 150 рублёў.

У шэрагу выпадкаў мінчанін агітаваў пацярпелых аформіць на сябе карту растэрміноўкі аднаго з банкаў, таксама абавязваючыся самастойна пагашаць доўг. За гэта ён плаціў адносна невялікія сумы — да 400 рублёў.

Прысвоеныя ў жыхароў сталіцы мабільныя прылады і аксесуары да іх малады чалавек перапрадаваў, а грашовыя сродкі траціў на асабістыя патрэбы. Абавязацельстваў па пагашэнні растэрміноўкі плацяжоў ён не выконваў, адпаведна, плаціць павінны былі даверлівыя аматары лёгкай нажывы.

У асноўным ахвярамі прадпрымальнага махляра сталі маладыя людзі ва ўзросце ад 18 да 22 гадоў, якія хацелі хуткага заробку. Ужо ўстаноўлена каля 60 асоб, якія пацярпелі ад ашуканскіх дзеянняў хлопца. Сума прычыненай шкоды ўстанаўліваецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

26 САКАВІКА 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 6 (15883)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года


Імёны

ІЛЬЯ МІЦЬКО:

## «Буду спяваць «Халі-галі» і ў семдзесят!»



**«У нашай музыкі няма пэўнага жанру. Пакуль людзям падабаюцца кампазіцыі, яны будуць гучаць вечна!» — кажа нязменны саліст «Лепрыконсаў».**
**Творчая кар'ера суразмоўніка пачалася яшчэ ў чатырнаццаць гадоў, калі выпускнікі школы запрасілі яго стаць вакалістам іх групы. Але ў канцы навучальнага года праз пастаяннае «вылузванне» хлопцы выгналі будучага куміра некалькіх пакаленняў. Пасля няўдалага вопыту Ілья запаліўся марай стаць артыстам і цэлае лета працаваў на будоўлі, каб назбіраць грошай на інструменты і апаратуру. А першага верасня 1996 года стварыў групу «Лепрыконсы», быўшы вучнем дзявятага класа. Яна пачынала з выканання песень Nirvana і The Offspring, а потым стала займацца стварэннем уласных хітоў.**

— Над назвай калектыву мы думалі доўга, нам хацелася чагосьці простага і ў той жа час яскравага. І аднойчы наш барабаншчык Андрэй Малашэнка прыйшоў на рэпетыцыю і сказаў: «Хлопцы, давайце будзем Lepricons (слова з ірландскай міфалогіі, якое азначае істот, падобных на гномаў). Нас жа ніхто ўсур'ёз не ўспрымае, а мы будзем такія прагныя да папулярнасці і поспеху і ўсяго даб'ёмся». Нам спадабалася. Слова фанетычна цікавае і незвычайнае, яго корань «лепрыко» азначае «прыкол», што было блізкім для нас. Напачатку назва пісалася па-англійску — Lepricons. Але праз некалькі гадоў мы перайшлі да выканання рускіх песень і дабавілі літару «Ы». На самай справе людзям у асноўным не запамінаецца наша назва, але калі яна запала, дык гэта на ўсё жыццё, — упэўнены саліст.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

На слыху

## ШКОЛЬНЫ ГВАЛТ: АДЗІН СУПРАЦЬ УСІХ

### Паведамляць пра выпадкі пераследу — гэта акт адвагі

**Фільм Ралана Быкава «Пудзіла» пра шасцікласніцу Лену Бяссольцаву, якая здолела выстаяць у сутыкненні з подласцю, здрадай і цкаваннем з боку аднакласнікаў, пасля выхаду на экран адразу выклікаў шырокі рэзананс у грамадстве. Некаторыя палічылі, што ён ганьбіць савецкіх дзяцей, нават прапаноўвалі знішчыць кінастужку. У 80-я гады XX стагоддзя слова «булінг» ніхто яшчэ не ведаў, але сама гэта сацыяльная з'ява была. Вось толькі за сцены школ праблему падлеткавага гвалту стараліся не выносіць.**
**У 2018 годзе наша краіна пры падтрымцы Сусветнага банка развіцця ўдзельнічала ў міжнародным параўнальным даследаванні PISA па ацэнцы адукацыйных дасягненняў вучняў, а таксама школьнага асяроддзя. У анкеце прапаноўваліся ў тым ліку і пытанні пра булінг. У выніку 19 працэнтаў 15-гадовых падлеткаў прызналіся, што зазнавалі ганенні некалькі разоў на працягу апошняга месяца. А па звестках прадстаўніцтва Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі з цкаваннем з боку равеснікаў сутыкаюцца 60 працэнтаў вучняў школ і гімназій.**




**Падчас круглага стала, арганізаванага ўстановай падтрымкі настаўніцкіх ініцыятыў «ЭдКэмп», беларускія педагогі, псіхолагі і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый шукалі адказы на пытанні, як дзейнічаць у сітуацыі цкавання і ці можна спыніць булінг.**

### У САЦЫЯЛЬНАЙ ІЗАЛЯЦЫІ

— Важна адрозніваць булінг ад канфлікту, — папярэджвае **псіхолаг SOS-Дзіцячай вёскі ў Бараўлянах Марына САСНІНА.** — У першым выпадку існуе дысбаланс улады: хтосьці валодае пэўнымі якасцямі або статусам, якія даюць яму адчуванне перавагі над іншым. У канфлікце ж узаемадзейнічаюць роўныя. Адбываецца сутыкненне іх інтарэсаў, абодва адстойваюць свой пункт гледжання і даюць здачы. Булінг — гэта наўмыснае дзеянне, у адрозненне ад канфлікту: канфлікт не планую́ць, ён здараецца.

Пад булінгам разумеюць сістэматычны пераслед каго-небудзь групай або асобным чалавекам, вербальны і (ці) фізічны. Але булінгам можа быць і сацыяльная ізаляцыя, якая траўміруе не менш, чым славесная агрэсія. З пэўным дзіцем у класе не жадаюць садзіцца побач, не клічуць яго ў гульні. Калі адбываецца размеркаванне па камандах, напрыклад на ўроку фізкультуры, гэтае дзіця выбіраюць апошнім ці ўвогуле не бяруць.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Экстрым

## «ПАКУЛЬ Я НА МАТАЦЫКЛЕ, МНЕ НІЧОГА НЕ СТРАШНА!»

### Інтэрв'ю з «Краю Зямлі», далей ад якога толькі пінгвіны і Антарктыда

**Хуткасць, драйв і буркатанне матора — вось тыя тры складнікі, што робяць шчаслівай нашу гераіню. Мінчанка Кацярына ДУБАНЕВІЧ на момант размовы праз сеціва знаходзілася ў кругасветнай вандроўцы ўжо 555 дзён (калі вы зараз чытаеце гэтыя радкі, то, вядома, лічба іншая), праехаўшы больш за сто тысяч кіламетраў (тут таксама трэба рабіць папраўку ў бок павелічэння). У скарбонцы ўражанняў у яе — безліч найпрыгажэйшых месцаў нашай планеты і сотні новых сустрэч, многія з якіх перараслі ў моцнае сяброўства. З іншага боку, на ўласным вопыце яна зразумела, што падарожнічаць не заўсёды проста — чатыры крадзяжы, адно ўзброенае рабаванне, дзве перанесеныя ліхаманкі, некалькі непрыемных падзенняў, замена рухавіка і візавыя праблемы... Але, нягледзячы на ўсё гэта, яна зноў садзіцца на свайго вернага сябра BMW F650 GS, які мае ўласнае імя Генры, і адпраўляецца заваёўваць новую краіну.**

— Мая першая паездка на матацыкле была зусім выпадковая. Мне было чатырнаццаць, і старэйшыя хлапчукі пракацілі на зялёным «Кавасакі» па полі за горадам. Уражанні ў такім узросце моцна перабольшаныя, але менавіта гэты дзень можна лічыць пачаткам маёй вялікай любові да двухколавай тэхнікі. Было страшна, высокая трава балюча біла па каленках, а шлем не падыходзіў па памеры і пастаянна спаўзаў на вочы, але адчуванне хуткасці і пачуццё свабоды я запомніла на ўсё жыццё, — прыгадвае дзяўчына.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*



# ШКОЛЬНЫ ГВАЛТ: АДЗІН СУПРАЦЬ УСІХ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Уявіце сабе, што вы прыйшлі на работу, а ў настаўніцкай вас ігнаруюць усе калегі, вы звяртаецеся да іх, а яны дэманстратыўна адварочваюцца ці адыходзяць. Што вы адчуеце? — прапануе спраецыраваць сітуацыю на сябе Марына Сасніна. — Кожнае дзіця мае права адчуваць сябе ў школе ў бяспецы, і педагогі павінны ўзяць на сябе за гэта адказнасць. Задача дарослых — своечасова заўважыць, умяшацца і вырашыць сітуацыю з булінгам. Самі вучні такога зрабіць ніколі не змогуць. Але гэта ў сілах класнага кіраўніка ці іншага педагога, які карыстаецца ў школьнікаў аўтарытэтам. Паверце, нават хатні гвалт можа нанесці менш шкоды, чым булінг у школе.

У грамадстве існуе меркаванне, што дзіцяці «трэба праз усё прайсці, такія сітуацыі загартоўваюць, вырасце — будзе мужыком». Яму кажуць: «Не данось», «Спраўляйся сам». Але булінг не загартоўвае. Шэраг даследаванняў паказалі, што людзі, якіх у дзяцінстве цкавалі, больш схільныя ў маладым узросце да суіцыду, трывожных расстройстваў і дэпрэсій. У іх заніжаная самаацэнка, а іх паспяховасць у школе можа пачаць моцна «кульгаць».

**«Ёсць розніца паміж даносам і абаронай жыцця і годнасці сваёй або свайго сябра».**

Як правіла, булінг праяўляецца ў другім—сёмым класах. Гэта той узроставы перыяд, калі дзеці вучацца ўзаемадзейнічаць у калектыве, вызначаюць, дзе іх месца, якія ролі яны могуць прымераць на сябе.

— Часта цкаванне распачынаецца менавіта ў пачатковых класах, калі яшчэ не выпрацаваліся нейкія сацыяльныя нормы і правілы. Дзеці, як правіла, раўняюцца на настаўніка, ён для іх — важная асоба. Але здараецца, што самі настаўнікі, наўмысна ці ненаўмысна, правакуюць булінг, — папярэджвае Марына Сасніна. — Напрыклад, калі ў класе з'яўляецца нязручны ці занадта актыўны вучань, педагог можа сказаць: «Праз яго ўсе паказчыкі класа зніжаюцца, ён нас тармозіць». Што чуюць у гэты момант яго аднакласнікі? Што Іванова, Пятрова, Сідарава трэба з групы выгнаць. Між іншым, прыналежнасць да яе — адна з нашых базавых патрэб. Нам вельмі страшна апынуцца ў ізаляцыі.

Калі ў школе адбываецца цкаванне, пакутуе не толькі яго ахвяра, але і сведкі, якія назіраюць і нічога не робяць, каб спыніць. І вінаватыя заўсёды таксама ўсе, і настаўнікі ў тым ліку. А дзіцяці важна разумець, што яно не адно, што яму ёсць да каго звярнуцца па падтрымку.

## ЗАБЫЦЦА ПРА ЎСІХ

**Старшы выкладчык Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка і навуковы супрацоўнік РНПЦ псіхічнага здароўя Наталля ГРЭБЕНЬ** каля пяці гадоў вывучае сітуацыю з булінгам у беларускіх школах.

У сваё апошняе даследаванне яна ўключыла тры мінскія школы — пяць класаў, у якіх вучыцца 150 чалавек. Паводле яе звестак, псіхалагічнае цкаванне ў навучальных установах дамінуе над фізічным. І толькі 7 працэнтаў тых, хто цкуе, гатовыя прызнацца, што яны сістэматычна праяўляюць агрэсію або зневажаюць іншых.




### ЯК ЗРАЗУМЕЦЬ, ШТО ДЗІЦЯ СТАЛА АХВЯРАЙ БУЛІНГУ?

1. Яно не хоча ісці ў школу. Прапускае заняткі, рэзка пагоршылася паспяховасць.
2. Звярніце ўвагу на яго позу: уцягнутая ў плечы галава, згорбленая спіна, апушчаны падбародак... Калі раней такога не назіралася, варта пацікавіцца справамі ў школе.
3. Скаргі на мігрэні, боль у жываце. Яны могуць быць выкліканы стрэсам і страхам сутыкнуцца з крыўдзіцелямі.
4. Часта дзіця вяртаецца дадому з сінякамі, у брудным ці сапсаваным адзенні.
5. Замкнёнасць. Раней гаваркое, яно рэзка зрабілася маўчуном. Сыходзіць у сябе.
6. Знікаюць асабістыя рэчы — сшыткі, падручнікі, адзенне, грошы.
7. Дзіця выдаліла акаўнты ў сацсетках. Магчыма, такім чынам яно спрабуе абараніцца ад кібербулінгу.



### ШТО РАБІЦЬ БАЦЬКАМ?

1. Паспрабуйце пагаварыць з сынам ці дачкой, высветліце падрабязнасці булінгу (хто здзяйсняе цкаванне, пры якіх абставінах, у чыёй прысутнасці, дзе ў інтэрнэце размешчаны абразлівыя выпады).
2. Звярніцеся да класнага кіраўніка, у сацыяльна-псіхалагічную службу, адміністрацыю ўстановы адукацыі.
3. Пагутарыце з крыўдзіцелем і яго бацькамі. Ад іх паводзін (прызнання, непрызнання віны, жадання прынесці прабачэнні, кампенсаваць прычыненую шкоду) залежаць вашы далейшыя дзеянні. Гэтым можна абмежавацца, калі педагогі і адміністрацыя навучальнай установы разумеюць праблему, працуюць як з агрэсарам, так і з класам, а бацькі крыўдзіцеля імкнуцца мінімізаваць наступствы.

Хлопцы крыху часцей церпяць ад булінгу, чым дзяўчаты, але розніца нязначная. «Калі мне трэба ісці ў школу, у мяне псуецца настрой», «у класе нікому да мяне няма справы», «у мяне няма сапраўдных сяброў», «мару хутчэй скончыць школу і забыцца пра ўсіх», «былі выпадкі, калі аднакласнікі псавалі мае асабістыя рэчы», «некаторыя з іх звяртаюцца да мяне па мянушцы», «некаторыя з аднакласнікаў могуць мяне штурхнуць ці ўдарыць», «былі сітуацыі, калі аднакласнікі пагражалі мне», — прызнаюцца дзеці.

**Для беларускіх дзяцей, якія зазналі ганенні, адкрыта бясплатная кругласутачная тэлефонная лінія па нумары 8 801-100-16-11.**

Апытанне паказала: 68 працэнтаў падлеткаў зазнаюць булінг час ад часу, 17 працэнтаў — ніколі і 14 працэнтаў — пастаянна.

Але булінг — гэта не заўсёды агрэсія. Падлетак можа адчуваць агіду, пагардлівасць у адносінах да аднакласніка. Гэта іншая эмоцыя, але яна — таксама праява булінгу. А вось выкарыстанне мянушкі можа быць і не абразай, а толькі элементам субкультуры: усё залежыць ад таго, як ставіцца да яе падлетак, ці выклікае яна ў яго эмацыянальныя перажыванні.

## ШУКАЙ ДАРОСЛАГА!

Не кожны школьнік ведае, што менавіта з'яўляецца гвалтам, як трэба дзейнічаць у падобных сітуацыях, да каго і калі звяртацца. Але галоўнае, не ўсе ўпэўненыя, што іх звароты будуць успрыняты сур'ёзна і дарослыя яшчэ больш не ўскладняць сітуацыю. Вядома, адбіваецца і ціск агульнавядомых стэрэатыпаў кшталту «ахвяра часта сама вінаватая», «калі скардзішся, значыць, ён слабы, даносчык, шасцёрка і гэтак далей»...

— Першае правіла — шукай дарослага, які табе дапаможа. Не пачуў адзін — звярніся да іншага ці да нас! — раіць **спецыяліст Рэспубліканскага цэнтра псіхалагічнай дапамогі Эмілія БУРАЧЭЎСКАЯ. — Наш тэлефон гарачай лініі +375 17 300 1006.** Казаць праўду і паведамляць пра выпадкі запалохвання і пераследу — гэта акт адвагі. Ёсць розніца паміж даносам і абаронай жыцця і годнасці сваёй або свайго сябра.

Зацікаўленасць у вырашэнні канфліктаў павінны праяўляць у першую чаргу настаўнікі і адміністрацыя школ. Менавіта ў іх павінен быць дакладны алгарытм дзеянняў, як спыніць гвалт, аказаць дапамогу пацярпеламу, дакументальна зафіксаваць факт, разабраць сітуацыю з наступным яе вырашэннем, падтрымаць усіх удзельнікаў канфлікту, у тым ліку крыўдзіцеля і сведак. Як паказвае практыка, умяшанне дарослых можа спыніць здзекі над вучнямі на корані.

### КУДЫ МОЖНА ЗВЯРНУЦЦА ЯШЧЭ?

1. Ва ўпраўленне (аддзел) адукацыі мясцовага выканкама ці адміністрацыі раёна ў горадзе.
2. Да ўчастковага міліцыянера.
3. У пракуратуру, напрыклад, у выпадку нанясення дзіцяці цялесных пашкоджанняў.
4. У Нацыянальную камісію па правах дзіцяці.
5. У органы апекі і папячыцельства.
6. У суд, калі ў дачыненні да дзіцяці здзейснена злачынства. Суд разглядае крымінальныя справы аб наўмысным нанясенні лёгкага цялеснага пашкоджання (артыкул 155 КК), паклёпе (артыкул 188 КК), абразах (артыкул 180 КК).

— У сітуацыі булінгу дзіця транслюе тыя нормы паводзін, якія дапушчальныя ў калектыве, дзе яно знаходзіцца. Атрымліваецца, што нават калі мы прыбяром з класа агрэсара альбо ахвяру, іх месца зойме нехта іншы. Таму што гэтая сістэма дысфункцыянальная і дазваляе так сябе паводзіць, — папярэджвае псіхолаг. — Праблема не ў канкрэтным вучні, а ў тым, што так паводзіць сябе з аднакласнікамі лічыцца дапушчальным.

Для мяне гэта драматычная сітуацыя, калі ты прыходзіш у школу, вядзеш з педагогамі размову пра каштоўнасці, а яны размаўляюць адно з адным на іншыя тэмы. А потым раптам уключаюцца і пачынаюць расказваць: «А вось мы змагаемся з дзіцем, і ўсё беспаспяхова...» Гэта значыць, дэманструюць паводзіны, у якіх папракаюць сваіх вучняў. І дастукацца, давесці да іх, што дзеці глядзяць на настаўнікаў, капіруюць іх мадэль паводзін, вельмі праблематычна. Пэўная частка настаўнікаў не разумее, што такое гвалт, годнасць, каштоўнасці і асабістыя межы...

**Булінг — не заўсёды агрэсія. Падлетак можа адчуваць агіду, пагардлівасць у адносінах да аднакласніка.**

**Кансультант па пытаннях абароны правоў дзіцяці прадстаўніцтва Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі Марына АНАНЕНКА** паведаміла, што для беларускіх дзяцей, якія зазналі ганенні, адкрыта бясплатная кругласутачная тэлефонная лінія. Патэлефанаваўшы **на нумар 8 801-100-16-11,** яны могуць ананімна расказаць пра сваю праблему спецыялістам і атрымаць дапамогу. Кансультанты максімальна імкнуцца пераканаць дзяцей, якія тэлефануюць, у тым, што да сітуацыі лепш за ўсё прыцягнуць спецыялістаў (калі зварот звязаны з фактам гвалту), дарослых (калі гаворка ідзе пра булінг у школе) і падказваюць патрэбныя кантакты і адрасы.

Таксама Марына Ананенка параіла звярнуць увагу на сайт **kids.pomogut.by,** дзе не толькі дзеці, але і дарослыя могуць знайсці карысную інфармацыю. Ён змяшчае парады, як зрабіць стасункі ў сетцы бяспечнымі, абараніць сябе ад кібербулінгу, сексуальнай эксплуатацыі і іншых формаў гвалту. Другая важная функцыя — дапамога праз чат дзецям, якія пацярпелі ад гвалту ў інтэрнэце, а таксама іх бацькам. Штодня з 8.00 да 20.00 у анлайн-рэжыме можна задаць пытанні на ўмовах ананімнасці. Адказы даюць прафесійныя псіхолаг і юрысты.

* * *

Пакуль што ў беларускім заканадаўстве няма паняцця булінгу і канкрэтнай адказнасці за цкаванне. Аднак у шэрагу законаў згадваюцца прыкметы, якія трапляюць пад вызначэнне булінгу, таму прыцягнуць агрэсара да адказнасці ўсё ж такі можна.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота з адкрытых крыніц і арганізатараў.**

Лакацыі актыўнасці

# Быць з ідэяй — быць першым

**Вызначыліся фіналісты конкурсу ідэй для старшакласнікаў «Першыя»: падведзены вынікі трэцяга этапу сацыяльна-адукацыйнага праекта для вучняў 9, 10 і 11 класаў. Дзесяць школьнікаў з усёй краіны публічна прадставяць свае ідэі па экалогіі, тэхналогіям, інклюзіі і культуры. Іх прэзентацыі адбудуцца на маштабнай маладзёжнай канферэнцыі TEDxYouth@Minsk.**



Усяго ў адукацыйных варкшопах у Мінску і крэатонах у Гомелі, Віцебску, Магілёве і Гродне ўзялі ўдзел больш за тысячу школьнікаў. І больш як сто з іх даслалі відэапрэзентацыі сваіх ідэй для ўдзелу ў конкурсе. Найбольшую цікавасць беларускія старшакласнікі праявілі да кірунку «Культура» (39 працэнтаў ад агульнай колькасці). На кірунак «Экалогія» прыпала 27 працэнтаў ідэй, «Тэхналогіі» — 24 працэнты, «Інклюзія» — 10 працэнтаў.

Што можна зрабіць, каб вучні з захворваннямі пазваночніка маглі наведваць заняткі ў школе, як развіваць экалагічную культуру ў краіне, якім чынам сучасныя тэхналогіі могуць дапамагчы ў развіцці музеяў і пашырыць выкарыстанне беларускай мовы ў паўсядзённым жыцці — гэта толькі некаторыя са шматлікіх пытанняў, што паставілі перад сабой падлеткі.

Найлепшыя праекты вызначаліся па некалькіх крытэрыях. Журы звяртала ўвагу на адпаведнасць ідэі абранай тэме і яе фармулёўку, магчымасць рэалізаваць задуму, а таксама маштабнасць і мэтавую аўдыторыю, арыгінальнасць падыходу да вырашэння пытанняў у сферы экалогіі, тэхналогій, інклюзіі і культуры.

Сярод фіналістаў ёсць прадстаўнікі ўстаноў адукацыі не толькі з Мінска і абласных цэнтраў, але і са Слуцка, Іўя і аграгарадка Крэва. Кожны з іх будзе рыхтаваць дзесяціхвілінную прамову для TEDxYouth@Minsk разам з ментарамі — прадстаўнікамі беларускай супольнасці TED. Пасля выніковай прэзентацыі сваіх ідэй усе пераможцы атрымаюць у падарунак iPhoneXs.

Поўны спіс фіналістаў можна знайсці на сайце https://www.generation.a1.by/.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Новыя старты

# АДКРЫЙ СВАЮ «БРАМУ МАР»

**У БДУ вядзецца прыём заявак на ўдзел у Х рэспубліканскім літаратурным конкурсе «БрамаМар». Далучыцца да яго можа любы ахвотны з ліку старшакласнікаў, студэнтаў або магістрантаў. Работы прымаюцца на беларускай ці рускай мове.**




Конкурс пройдзе ў чатырох намінацыях: «Паэзія», «Проза», «Драматургія» і «Крытыка». Школьнікам прапануюцца першыя дзве катэгорыі. Работы ацэніць журы ў складзе вядомых беларускіх літаратараў, крытыкаў і журналістаў. Для фіналістаў спаборніцтва з мэтай удасканалення іх літаратурнага майстэрства арганізуюць тэматычныя майстар-класы, варкшопы і г. д.

Творы прымаюцца да 15 красавіка на электронную пошту bramauni@gmail.com, bramamar.college@gmail.com. Патрабаванні да афармлення тэкстаў размешчаны ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» (https://vk.com/bramamar). Вынікі конкурсу падвядуць напрыканцы мая.

Яго арганізатарамі выступаюць кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі, Міністэрства інфармацыі і Выдавецкі дом «Звязда».

Рэспубліканскі літаратурны конкурс «БрамаМар» упершыню прайшоў у 2010 годзе. Яго ініцыятарамі былі студэнты кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі БДУ. У 2018 годзе конкурсу быў афіцыйна прысвоены статус рэспубліканскага. Штогод яго ўдзельнікамі становяцца больш за 300 таленавітых школьнікаў і студэнтаў з усіх рэгіёнаў Беларусі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Даніна памяці

# Помнік Герою — аднавіць!

**Да 75-годдзя Вялікай Перамогі актыў Мінскай гарадской арганізацыі БРСМ адновіць на Усходніх могілках сталіцы помнік Герою Савецкага Саюза, генерал-маёру Аляксандру Васільевічу Кірсанаву, разбураны ў 2017 годзе вандаламі.**

На аднаўленне мемарыяла моладзь заробіць грошы на заводзе жалезабетонных вырабаў «Мінскметрабуда». Кожныя выхадныя на працягу месяца добраахвотнікі БРСМ будуць працаваць падсобнымі рабочымі на аб'ектах будаўніцтва Мінскага метрапалітэна. У такіх пачынах за гэты час плануецца задзейнічаць больш за 400 чалавек. Усе заробленыя імі сродкі пойдуць на рэканструкцыю абеліска Герою.

Званне Героя Савецкага Саюза Аляксандру Васільевічу Кірсанаву было прысвоена 15 студзеня 1944 года. З верасня 1941 года ён ваяваў на Паўднёвым, Цэнтральным і Беларускім франтах. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра ў Чарнігаўскай вобласці. У ноч на 28 верасня 1943 года стралковая дывізія пад яго камандаваннем пераправілася цераз раку, захапіла плацдарм і паспяхова адбіла шматлікія контратакі перавышаючых сіл праціўніка.

За час вайны яго імя 21 раз згадвалася ў зводках і загадах Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Аляксандр Васільевіч Кірсанаў з'яўляецца кавалерам ордэнаў Леніна (двойчы), Чырвонага Сцяга (чатыры разы), Суворава 2-й ступені, Кутузава 2-й ступені, Айчыннай вайны 1-й ступені і ганаровым грамадзянінам Чарнігава, Брагіна і Калінкавіч.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Галасы маладых

# Крок у будучыню: ад памкненняў да дзеянняў

**У БДПУ стартавала маладзёжная кампанія «Насустрач будучыні, якую мы хочам». У ходзе сустрэчы арганізатараў быў падпісаны план сумесных мерапрыемстваў паміж Міністэрствам адукацыі, Прадстаўніцтвам ААН у Рэспубліцы Беларусь і БДПУ.**

Што ўяўляе сабой кампанія і ў чым яе важнасць? У 2020 годзе ААН адзначае 75-годдзе свайго стварэння. У гэты знакавы год Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш ініцыяваў найбуйнейшую ў гісторыі арганізацыі кампанію па глабальнай дыскусіі «75 гадоў ААН: 2020 год і далей — агульная будучыня агульнымі сіламі» («ААН 75»). Абмеркаванне ролі ўсебаковага супрацоўніцтва ў пабудове лепшай будучыні заклікана ахапіць як мага большую колькасць людзей, і ў першую чаргу моладзь.

Беларусь далучылася да міжнароднай кампаніі «ААН 75», пацвердзіўшы на самым высокім узроўні прыхільнасць канцэпцыі ўстойлівага развіцця і гатоўнасць зрабіць свой унёсак у святкаванне юбілею ў якасці краіны — заснавальніцы ААН.

Каардынатарам маладзёжнай кампаніі «Насустрач будучыні, якую мы хочам» выступае БДПУ. Ключавой яе падзеяй стануць адкрытыя дыскусіі «Будучыня, якую мы хочам: нашы ідэі і дзеянні». У іх возьмуць удзел студэнты БДПУ, рэгіянальных універсітэтаў — суб'ектаў кластара бесперапыннай педагагічнай адукацыі, навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, дзе функцыянуюць профільныя педагагічныя класы, прадстаўнікі рэсурсных цэнтраў Асацыяцыі «Адукацыя ў інтарэсах устойлівага развіцця», маладзёжныя паслы Мэт устойлівага развіцця.

У ходзе дыскусій моладдзю будзе прадстаўлена бачанне будучыні свету. Студэнты і школьнікі падзеляцца вопытам папулярызацыі каштоўнасцяў і Мэт устойлівага развіцця і рэалізацыі маладзёжных ініцыятыў. Пазіцыя беларускіх юнакоў і дзяўчат наконт будучыні свету, выпрацаваная ў ходзе дыскусій, будзе прадстаўлена на 75-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у верасні гэтага года.

Акрамя таго, маладзёжная кампанія «Насустрач будучыні, якую мы хочам» прадугледжвае правядзенне маладзёжнага медыяфестывалю «Галасы маладых за ўстойлівае развіццё», серыі маладзёжных акцый і ініцыятыў «Нікога не пакінем убаку», рэалізацыю інтэрнэт-праекта «Мэты ўстойлівага развіцця: думай і дзейнічай». Стартавая сустрэча праходзіла ў анлайн-рэжыме. Пасля падпісання плана сумесных мерапрыемстваў з адкрытай лекцыяй выступіла пастаянны каардынатар ААН у Рэспубліцы Беларусь Іаана Казана-Вішнявецкі. Яна казала аб сусветных праблемах, пагрозах і выкліках сучаснасці. Падчас анлайн-трансляцыі з рэгіёнаў паступіла больш за 40 пытанняў. На найважнейшыя з іх спікер дала разгорнутыя адказы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Камертон настрою

# Адчуваць жыццё на максімуме

## А ўвесь рэцэпт — ва ўпэўненасці ў сабе

**І выступоўца, і вядучы, і аўтар... гімна. Яго актыўнасці можна толькі пазайздросціць. Знаёмцеся: Дзмітрый БЕРАЗОЎСКІ, студэнт трэцяга курса ўлікова-фінансавага факультэта Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі. Сёлета хлопец стаў фіналістам рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года». І гэта далёка не ўсе кейсы нашага героя.**

— Мае звычайныя дні праходзяць у рэжыме нон-стоп: рэпетыцыі да мерапрыемстваў, канцэрты, якія часам адбываюцца ў розных гарадах, — усміхаючыся, кажа дваццацігадовы Дзмітрый.

Суразмоўнік актыўнічае як у рамках грамадскай дзейнасці ўніверсітэта, так і ў навуковай сферы. На першым курсе Дзіма перамог у конкурсах «Містар універсітэт» і «Найлепшы вядучы», праз некаторы час стаў намеснікам старшыні пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў, членам БРСМ і байцом маладзёжнага атрада аховы правапарадку ўніверсітэта. Акрамя таго, летась герой стаў стыпендыятам Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

— Адчуваць жыццё па максімуме — гэта ж крута, цікава і весела. Вольнага часу ў мяне практычна няма, але я такі актыўны з дзяцінства. Лічыў, што сядзець за камп'ютарам гадзінамі запар нецікава, хацелася задзейнічаць сябе ў нечым карысным. Таму з трэцяга класа пачаў займацца спевамі і танцамі ў музычнай школе. Да таго ж працаваў у Беларускім таварыстве Чырвонага Крыжа, і цяпер у рамках універсітэцкага руху разам з іншымі студэнтамі езджу ў прытулкі для жывёл, дзіцячыя



дамы, удзельнічаю ў розных дабрачынных мерапрыемствах. Думаю, схільнасці да творчасці ў мяне ад мамы, якая ў свой час скончыла музычную школу, пасля атрымала некалькі вышэйшых адукацый і цяпер працуе ў той сферы, якая ёй падабаецца, — дзеліцца герой.

Заканчваючы школу, Дзіма быў упэўнены: яго чакае Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. Але з-за пэўных абставін са здароўем хлопец туды не паступіў.

— Таму вырашыў год папрацаваць у родным Гродне, прыслухацца да сябе: у якім кірунку хачу развівацца. Рашэнне аб тым, што буду бухгалтарам, прымалася спантанна. Але не пашкадаваў, гэтыя веды дакладна спатрэбяцца ў жыцці. Хоць адчуваю, што манатонная праца не па мне. Памятаю, калі на першым курсе ў студэнтаў пыталіся, якія ў нас ёсць здольнасці, каб вызначыць кірунак далейшай дзейнасці ва ўніверсітэце, я быў гатовы рабіць што заўгодна, толькі б не сядзець на адным месцы.

Пытаюся, ці паспявае Дзіма з такім загружаным графікам наведваць пары...

— Часам прапускаю, з-за чаго вельмі хвалюецца мама. Але я хутка засвойваю патрэбную інфармацыю і досыць кемлівы. Магу, напрыклад, падрыхтавацца да экзамена за дзень да яго і адказаць «на выдатна». Такая здольнасць дапамагае і ў творчасці. Бывае, што да выхаду на сцэну застаецца хвіліна, а мне даюць у рукі новы сцэнарый мерапрыемства і кажуць: ты зможаш. Для артыста гэта нармальная сітуацыя. Мы павінны быць гатовыя да ўсяго. Калі прапанавалі стварыць гімн для конкурсу «100 ідэй для Беларусі», я без роздуму пагадзіўся, і атрымалася даволі хутка — за тыдзень паставленую задачу выканаў. Дарэчы, хтосьці са знаёмых перакананы, што я хвалько, але гэта не так. Я проста ўпэўнены ў сабе і лічу, што гэта добра. Мне цяжка ўявіць таго, хто ўсюды выступае і пры гэтым сціплы, — адказвае суразмоўнік.

— Ты пішаш тэксты, захапляешся музыкай. Калі выбіраць паміж тым, стаць самому зоркай або зрабіць ёй кагосьці іншага...

— Схіляюся да другога. Мне падабаецца прадзюсарская гісторыя, калі знаходзішся ў цяні і прасоўваеш свайго пратэжэ. Але і ідэі наконт прасоўвання сябе самога таксама ёсць. Зараз маю некалькі варыянтаў развіцця маёй будучыні, але кім буду праз некалькі гадоў, сказаць пакуль цяжка. На сённяшні дзень ёсць магчымасці выбіраць — і ў гэтым перавага майго ўзросту.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота дадзена героем.**

*Бачыць мэту*

# На адной мове і на адной хвалі

**Наталля НАШУК — маладая выкладчыца англійскай мовы ў сярэдняй школе № 2 гарадскога пасёлка Акцябрскі Гомельскай вобласці. Яе заняткі не абыходзяцца без сучасных тэхналогій і нетыповага падыходу да сваёй работы. Адна з найважнейшых мэт гераіні — даваць разнастайныя веды дзецям з першых дзён навучання, каб у будучыні яны ім спатрэбіліся напоўніцу. Як у яе гэта атрымліваецца?**




— Памятаю, яшчэ з малодшых класаў у мяне была выразная мэта, да якой я ішла, — факультэт замежных моў у Гомельскім дзяржаўным універсітэце. Мае жаданне споўнілася: я скончыла гэтую ВНУ па спецыяльнасці «Англійская мова. Французская мова». Цяпер у маім «падпарадкаванні» шосты, два сёмыя, дзясяты і адзінаццаты класы.

Наталля расказвае, што любоў да англійскай мовы ў яе ўзнікла яшчэ ў дзяцінстве: у той час маленькая дзяўчынка па праграме «Дзеці Чарнобыля» ездзіла ў Канаду штогод. Такім чынам суразмоўніца паглыбляе свой узровень ведаў ужо 17 гадоў.

— У мяне было мэтавае накіраванне, таму ведала, што адпрацоўваць прыеду ў родны пасёлак. Але гэта зусім не бянтэжыла, наадварот. Калегі паставіліся да мяне як да навыспечанага маладога спецыяліста добра. У першы год работы — два з паловай гады таму — вучыла трэція, чацвёртыя і пятыя класы. Праз некаторы час да іх далучыліся старэйшыя хлопчыкі і дзяўчаты.

Настаўніца падчас сваіх заняткаў часта выкарыстоўвае мабільныя праграмы, розныя брытанскія і амерыканскія сайты, QR-коды, арганізоўвае размовы дзяцей з носьбітамі англійскай мовы па скайпе — так у вучняў павышаецца матывацыя і расце цікавасць да яе вывучэння.

— Бывае, што я планую ўрок, але штосьці ідзе не так. Дзецям хочацца нешта сказаць не па тэме або выказаць думкі словамі, якіх увогуле няма ў англійскай мове. У такія моманты вельмі цікава з імі назіраць *(усміхаецца)*. Дарэчы, работа з вучнямі малодшых класаў і старэйшых істотна адрозніваецца. Напрыклад, у трэцім-чацвёртым шмат танцаў, песень, гульняў. Малыя іншым часам не вельмі разумеюць, навошта ім тая замежная мова. А ў дзясятым-адзінаццатым, наадварот, хлопцы і дзяўчаты вельмі сур'ёзна ставяцца да маіх слоў, імкнуцца вучыцца не толькі для здачы школьных і ўніверсітэцкіх іспытаў, але і для самаразвіцця.

Наталля расказала, што летась яна атрымала класнае кіраўніцтва. Дзяўчына прызнаецца, што калі б ёй прапанавалі заняцца такой справай у першы год работы, адмовілася б, бо тады не хапала ўпэўненасці ў сваіх сілах.

— У маім шостым класе 24 вучні: 14 хлопчыкаў і 10 дзяўчынак. Яны часта расказваюць мне пра розныя падзеі са свайго жыцця, пытаюць парады. Лічу, што гэта добра, бо настаўнік павінен сумяшчаць у сабе навыкі з розных прафесій, у прыватнасці быць добрым псіхолагам. Я на «адной хвалі» з імі: разумею музыку, якую яны слухаюць; ведаю, што ім падабаецца здымаць відэа ў TikTok, Like і Instagram. У вольныя хвіліны падыходзяць да мяне і абдымаюць. Спачатку гэта было дзіўна, але з часам прызвычаілася *(усміхаецца)*.

Суразмоўніца ўпэўнена: тэлефоны, планшэты і іншыя гаджэты вучняў падчас урокаў павінны заўсёды знаходзіцца ў настаўніка.

— Калі прыйшла працаваць у школу, стала заўважаць, што на перапынках дзеці вельмі шмат часу сядзяць у сваіх мабільных. І нават калі пачыналіся заняткі, некаторыя не маглі адысці ад эмоцый, якія яны атрымлівалі падчас гульняў. Выклік да дошкі — а ў вачах страх і неразуменне: «Якое было пытанне?» Мы праводзілі размовы і з вучнямі, і з іх бацькамі па гэтай праблеме, усе пагадзіліся, што ад забавак трэба адмовіцца.

Сёлета Наталля здала кваліфікацыйны экзамен на другую катэгорыю, да таго ж паспела заняць другое месца ў раённым конкурсе «Настаўнік года».

— У фінале было пяць педагогаў рознага ўзросту і прафесійнага стажу. Шчыра кажучы, гэта пакуль што быў самы каштоўны вопыт у маім жыцці. На пэўных этапах конкурсу мы давалі адкрытыя ўрокі, паказвалі свае таленты і ўменні прафесійнаму журы. Я чалавек амбіцыйны, таму з задавальненнем прыняла такі выклік. Незнаёмыя людзі пасля фіналу падыходзілі да мяне і казалі прыемныя словы. Так, не перамагла, але засталося жаданне зрабіць гэта наступным разам. Увогуле нам, настаўнікам, перыядычна прапаноўваюцца розныя курсы, семінары, і я з ахвотай іх наведваю.

Гераіня кажа, што часам яна адчувае пустату — амаль уся энергія пераходзіць да любімых вучняў. Але такі душэўны стан доўжыцца нядоўга.

— Вольны час адводжу на падтрыманне здаровага спосабу жыцця, па выхадных сустракаюся з сябрамі... Нават не задумвалася, які лёс мяне чакае пасля адпрацоўкі ў школе. Ніколі не было важна, дзе буду жыць: у маленькім або вялікім горадзе. Больш нават пасёлак падабаецца. Спадзяюся, што сваёй прысутнасцю ў Акцябрскім у якасці настаўніцы я камусьці дапамагу з выбарам прафесіі або з нечым іншым. Дзе ж мне яшчэ быць, як не побач з вучнямі?

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота з архіва гераіні.**

*У ліку найлепшых*

## Па справах — і ўзнагарода

**Гэтых маладых людзей вабяць імклівае жыццё, чарговыя сустрэчы і новыя сябры... Дзіяна БУРМІЧ і Кірыл ГРОМАЎ увайшлі ў сотню найлепшых актывістаў БРСМ сталіцы, уганараваных нядаўна штогадовай гарадской прэміяй «За Дело» за ўнёсак у дзейнасць Саюза моладзі па выніках мінулага года. Давайце бліжэй пазнаёмімся з героямі і іх справамі.**



У БРСМ Дзіяна са школы, была там сакратаром пярвічнай арганізацыі. Дзяўчыне падабалася дапамагаць у падрыхтоўцы розных конкурсаў і праграм, камунікаваць з людзьмі. Ужо студэнткай працягвала ўдзельнічаць у розных праектах, што арганізоўваў БРСМ яе ВНУ. Любімая акцыя — «Адnaўленне святынь Беларусі». Акрамя таго, што Дзіяна атрымала персанальную ўзнагароду, яна была адным з арганізатараў мерапрыемства і ўручала прэміі іншым актывістам.

— Для мяне кожнае заданне — гэта нешта новае, а значыць, і цікавае. Самым незвычайным, хутчэй за ўсё, было прыбіраць стадыён «Дынама» пасля II Еўрапейскіх гульняў. Гэта работа ў камандзе, і я адчуваю сябе крута ў якасці арганізатара, — кажа дзяўчына.

Дзіяна вучыцца на настаўніка пачатковых класаў на трэцім курсе Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, але ўжо цяпер паралельна працуе ў Мінскім гарадскім камітэце БРСМ.



Кірыл у Саюзе моладзі таксама са школьных гадоў, калі ахвотна браўся за арганізацыю любой вечарыны. Самым буйным конкурсам, у якім удзельнічаў хлопец, стаў праект «Студэнт года — 2019».

— Тады на рэспубліканскім этапе я заняў трэцяе месца. Гэта быў для мяне самы запамінальны праект БРСМ... За што канкрэтна далі прэмію — дакладна адказаць не магу, таму што нашы справы — гэта мноства праектаў, конкурсаў, арганізаваных мерапрыемстваў і шмат чаго яшчэ, — падзяліўся юнак.

Кірыл вучыцца на другім курсе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, вывучае сацыяльна-культурную дзейнасць. Далей хлопец плануе звязаць сваё жыццё са сцэнай, у будучым марыць быць артыстам і працуе над гэтым ужо цяпер:

— Навыкі, набытыя ў праектах БРСМ, дапамагаюць мне раскрываць сябе, знаходзіць новыя якасці і карыстацца гэтым у розных сітуацыях.

**Кацярына КАСЦЕВІЧ,**
**студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

*Ведай нашых!*

## «Руляць» маладыя даследчыкі і журналісты

**Чацвёртакурснік факультэта журналістыкі БДУ Аляксандр ДАБРАНАЎ стаў сярэбраным прызёрам Міжнароднага конкурсу навуковых работ студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў і суіскальнікаў.**

Ён заняў другое месца ў намінацыі «Прыкладныя камунікацыі» з работай «Метанаратыў сучаснай рэкламы». Даследаванне студэнта прызнана адным з найлепшых і ў найбліжэйшы час будзе апублікавана ў штогадовым зборніку навуковых прац маладых даследчыкаў, які індэксуецца ў базе даных РІНЦ (Расійскі індэкс навуковага цытавання). Навуковым кіраўніком Аляксандра Дабранава выступіла загадчыца кафедры тэхналогій камунікацыі і сувязяў з грамадскасцю Ірына Сідорская.

Спаборніцтва прайшло ў рамках XIX Міжнароднай канферэнцыі «Медыя ў сучасным свеце. Маладыя даследчыкі» ў Санкт-Пецярбургу. Усяго яго ўдзельнікамі сталі 112 прадстаўнікоў 32 ВНУ Расіі і краін СНД.

Акрамя таго, навуковыя даклады студэнтаў факультэта журналістыкі БДУ атрымалі высокую экспертную ацэнку падчас работы канферэнцыі. Магістрант Надзея Тачыцкая ўзнагароджана дыпломам за найлепшы даклад у секцыі «Масмедыя і культура: вопыт узаемадзеяння». Сваю работу яна прысвяціла пытанням інтэрпрэтацыі спектакля ў арт-журналістыцы і літаратурна-мастацкай крытыцы. Даклад чацвёртакурсніцы Ксеніі Ганчарык «Сацыяльная рэклама як фактар развіцця грамадзянскай супольнасці» адзначылі спецыяльным прызам у секцыі «Найноўшыя тэхналогіі ў бізнес-PR».

Усяго ў рамках XIX Міжнароднай канферэнцыі «Медыя ў сучасным свеце. Маладыя даследчыкі» працавала 17 секцый, дзе былі разгледжаны даклады больш чым 300 маладых навукоўцаў у галіне журналістыкі, рэкламы і PR.

Арганізатарам мерапрыемства выступіла Вышэйшая школа журналістыкі і масавых камунікацый Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

### Даведка

Міжнародная канферэнцыя «Медыя ў сучасным свеце. Маладыя даследчыкі» — адна з найбуйнейшых канферэнцый маладых даследчыкаў і практыкаў журналістыкі, рэкламы і PR у Расіі. Яна праводзіцца пры ўдзеле факультэта журналістыкі МДУ імя М. В. Ламаносава, кафедры журналістыкі Ніжагародскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Яраслава Мудрага, Цэнтра навуковай камунікацыі Універсітэта ITMO.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


## НОВОЕ ПРЕДЛОЖЕНИЕ ОТ МТС: ТАРИФ «БЕЗЛИМИТИЩЕ+»

**МТС запустил тарифный план «Безлимитище+». Новое предложение включает неограниченный по объему и скорости интернет и бонус — бесплатный доступ к онлайн-кинотеатру ivi.**

Также в абонентскую плату нового тарифного плана включено 400 минут в месяц на звонки во все сети.

Кроме того, на «Безлимитище+» до конца лета пользователи могут делиться безлимитным интернетом с любыми устройствами в неограниченном объеме. С 1 сентября 2020 года для раздачи будет доступно 100 МБ в сутки. При превышении этого объема — стоимость составит 50 копеек в сутки.

Подключившись на «Безлимитище+», абонентская плата в течение первых 90 дней составит 17,50 рубля*, далее — 24,50 рубля в месяц. Стать абонентом нового тарифного плана можно по 30 апреля 2020 года.

Для перехода на «Безлимитище+» воспользуйтесь приложением «Мой МТС». Подробнее о тарифе смотрите на сайте компании.




*С условиями акции можно ознакомиться на сайте компании.

УНП 800013732
СООО «Мобильные ТелеСистемы»



# «ПАКУЛЬ Я НА МАТАЦЫКЛЕ, МНЕ НІЧОГА НЕ СТРАШНА!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Менавіта з гэтага моманту мотатэхніка стала аб'ектам любові і вывучэння нашай гераіні. Аднак уласны матацыкл яна змагла набыць толькі праз дзесяць гадоў.

**«Мая першая паездка на матацыкле была зусім выпадковая, але адчуванне хуткасці і пачуццё свабоды я запомніла на ўсё жыццё».**

— Гэта быў беласнежны «Мінск М4 200», маленечкі, на мой сённяшні погляд, але ён здаваўся сур'ёзнай агрэсіўнай машынай у той час. Першыя паездкі былі вакол дома, затым вакол горада, і паступова кола іх пашырылася да краіны, а затым і кантынента, — працягвае суразмоўніца.

Кацярына прызнаецца, што спачатку сядзець за рулём ёй было вельмі страшна і здавалася, што яна зусім не ўмее ездзіць. Але з вопытам з'явіліся і ўпэўненасць у сабе, і прага да вандровак.



Набыццё ўласнага транспарту стала не адзінай цяжкасцю, з якой сутыкнулася матацыклістка. Нягледзячы на тое, што ў сучасным свеце жанчыны паспяхова асвоілі мужчынскія прафесіі і захапленні, у краінах постсавецкай прасторы, а таксама ў некаторых дзяржавах з сур'ёзнымі рэлігійнымі асновамі яшчэ існуюць гендарныя стэрэатыпы. Кацярына не раз выслухоўвала выказванні пра тое, што яе месца на кухні, а не за рулём, што матацыклы — гэта мужчынская зона і яна парушае яе межы. Але, нягледзячы на гэта, не апускала рукі і ў 2012 годзе здзейсніла сваё першае падарожжа.

**«Дзяўчына ў шлеме з ружовымі хвосцікамі і на ружовым матацыкле крыва падпаўзае на спушчанай шыне і пагнутым колавым дыску».**

— Гэта адбылося дзякуючы майму сябру Дзіму Навіцкаму. Я тады працавала менеджарам у адной кампаніі, і мы рабілі сумесны праект. Якраз у той момант набыла свой другі матацыкл. Дзіма зайшоў да нас абмеркаваць некалькі дэталяў супрацоўніцтва і паміж іншым пацікавіўся, чаму я не падарожнічаю на ім, а яшчэ расказаў пра тонкую паласу сушы, якая злучае прыгожай звілістай дарогай Літву і Расію і называецца Куршскай касой. Яго аповед моцна запаў мне ў душу. Ужо вечарам я сядзела перад маніторам, накідваючы свой першы маршрут у «гугл. мапс» і складаючы спіс неабходных рэчаў для гэтага «мотадальнабою». Цяпер адлегласць у трыста кіламетраў для мяне здаецца нечым накшталт шпацыру ў суседні двор, а тады гэта была дарога ў невядомасць. Не абышлося і без прыгод.



Як толькі я перасекла граніцу Літвы, уляцела ў яму і прабіла пярэднюю шыну на маім ружовым матацыкле. Далей — усё як у кіно. Бачу знак шынамантажу і павольна паўзу да яго на прабітым коле. У дзвярах стаяць два механікі, глядзяць на мяне і напэўна не разумеюць, што адбываецца. Мокрая, спатнелая ад напружання дзяўчына ў шлеме з ружовымі хвосцікамі і на ружовым матацыкле крыва падпаўзае на спушчанай шыне і пагнутым колавым дыску. Мне пашанцавала, хлопцы хутка паставілі ў шыну жгут, напампавалі кола, не ўзялі ні капейкі, расказалі, якую рыбу пакаштаваць у Нідзе на Куршскай касе, і пажадалі шчаслівай дарогі. Шырока ўсміхаючыся і дзівячыся такому прыёму ў незнаёмай краіне, я хутка даехала да Вільнюса, замяніла шыну і яшчэ да вечара была ў Клайпедзе, а раніцай атрымлівала асалоду ад прыгажосці дзюн і «Танцуючага» лесу, — прыгадвае Кацярына.

**Кацярына не раз выслухоўвала, што яе месца на кухні, а не за рулём, што матацыклы — гэта мужчынская зона і яна парушае яе межы.**

Не ўсе падарожжы нашай гераіні былі настолькі ўдалымі, і за такі доўгі перыяд мотавандроўніцтва яна выявіла для сябе шэраг мінусаў. Першы — гэта, вядома ж, уразлівасць: тое, што для аўтамабіліста застанецца драпінай на бамперы, можа паслужыць прычынай смерці або цяжкіх калецтваў для матацыкліста. Другі мінус — залежнасць ад надвор'я. Калі ваша падарожжа праходзіць у дождж, холад ці моцную спякоту, то экіпіроўка можа стаць даволі некамфортнай. Важную ролю адыгрывае грузападымальнасць і ўмяшчальнасць, а яна ў матацыкла значна меншая, чым у аўтамабіля. Трэба моцна пастарацца, каб узяць усё, што неабходна для працяглага падарожжа. Ну і вядома ж, асноўным мінусам з'яўляецца вялікая маральная і фізічная нагрузка на кіроўцу матацыкла. Хуткасць рэакцыі павінна быць непараўнальна вышэйшая, чым за рулём аўтамабіля. Ад працяглай язды па дрэнных дарогах моцна стамляешся з-за напружання ўсіх цягліц цела. Той, хто думае, што мотавандроўкі — гэта лёгка і проста, глыбока памыляецца.



**«Калі б мяне папрасілі скласці топ-3 любімых краін для падарожжаў, то я назвала б Аўстралію, Мексіку і Японію».**



— Зараз я знаходжуся ў Ушуаі (горад у Аргенціне. — «ЧЗ».) — гэта мая 42-я краіна і самы крайні пункт Паўднёвай Амерыкі пад назвай «Край Зямлі», далей толькі пінгвіны і Антарктыда, — сказала на момант нашага інтэрв'ю Кацярына. — Наогул падабаюцца ўсе месцы, дзе я пабывала. У мяне атрымліваецца знаходзіць нешта цікавае ў кожнай краіне, бо ўсе яны розныя і ўражанні не толькі ствараюцца ад іх саміх у цэлым, але і дапаўняюцца рознымі сітуацыямі і новымі знаёмствамі. Калі б мяне папрасілі скласці топ-3 любімых краін для падарожжаў, то я назвала б Аўстралію, Мексіку і Японію. У хуткім часе хацела адправіцца ў Бразілію, Марока і Непал.

Каб захаваць у памяці ўсе свае вандроўкі і эмоцыі, Кацярына завяла электронны дзённік у інтэрнэце, дзе імкнецца кожны дзень пісаць пра тое, што бачыць.

— У першую чаргу гэты дзённік быў для сябе, сяброў і родных. Але мне вельмі прыемна, што іншыя людзі знаходзяць натхненне ў маіх фотаздымках і апавяданнях. У дарозе я раблю серыю фатаграфій у сукенках, каб не траціць жаноцкасці і злучыць выдатныя мясціны з маім настроем у той момант. Падарожжы сталі неад'емнай часткай мяне, без іх не ўяўляю свайго жыцця. Я ўсёй душой палюбіла Амерыку! Лётала на маленечкім самалёце над знакам «Галівуд», мыла прыбіральні і адчышчала дамы ў Лос-Анджэлесе, дапамагала мільянеру-паветраплавальніку на будоўлі басейна, дзівілася снегу ў Гранд Каньёне, разглядала дэталі інтэр'ера дома Элвіса Прэслі, блукала па затопленым саляным плата Баневіль, плаціла выкуп за скрадзены пашпарт у Мексіцы... Усё гэта толькі малая частка таго жыцця, якое можа быць у кожнага чалавека, у якога ёсць мэта і жаданне пазнаваць нешта новае, — упэўнена наша гераіня.

— Цяпер з многіх краін прыходзяць трывожныя весткі адносна каранавіруса. Гэтая навала неяк чынам паўплывала на далейшыя планы? — спытала я праз нейкі час пасля інтэрв'ю.

— Вядома ж, пандэмія ўнесла ў іх свае карэктывы. Я прапрацоўвала варыянт авіяпералёту разам з матацыклам у Мадрыд, а потым у Мінск. Але Аргенціна закрыла ўсе граніцы і адмяніла рэйсы ў Еўропу на 30 дзён. У цяперашняй сітуацыі я прыняла рашэнне перачакаць пік захваральнасці ў маленечкім мястэчку на мяжы з Бразіліяй і Парагваем, а затым шукаць магчымасці вяртання на наш кантынент.

**Ангеліна НОВІКАВА,**
**студэнтка III курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**
**Фота з архіва гераіні.**
**Больш здымкаў на сайце zviazda.by.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

### ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ

**ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-41597 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин № 8 «Ромашка»), обшей площадью 233,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Гастелло, 2**

Лот № 1 находится на земельном участке, кадастровый № 423650100006000396, площадью 0,1180 га (назначение – обслуживание магазина), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Гастелло, 2. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадью 0,0154 га; земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, площадью 0,0100 га; земли, находящиеся в охранных зонах магистральных трубопроводов и других линейных инжинерный сооружений, площадью 0,1095 га

Начальная цена продажи 184 800 руб. (сто восемьдесят четыре тысячи восемьсот рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 18 480 руб. (восемнадцать тысяч четыреста восемьдесят рублей)

**ОАО «Торгово-производственная фирма «Лида», 231300, г. Лида, ул. Кирова, 6. Тел. 8-0154-617-577, факс 8-0154-522-540**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 8-0152-55-87-70**

Условия проведения аукциона:
– возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 1,5 % от конечной цены продажи объекта;
– возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по изготовлению и регистрации технического паспорта на капитальное строение в сумме 306,80 руб.; по проведению независимой оценки в сумме 660 руб. и по проведению экспертизы достоверности оценки в сумме 287,10 руб.
Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 29 апреля 2020 г. в 11.00
по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

**Заявления на участие принимаются
по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208,
с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).
Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 23 апреля 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
https://grino.by/aukcion/**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: право заключения договора аренды сроком 5 лет части помещения площадью 42,1 кв. м по адресу: г. Гродно, ул. Суворова, 76А. Размер ежемесячной арендной платы 17,05 базовой арендной величины. Условия проведения аукциона: целевое назначение арендуемых площадей – склад, производственное помещение, офис.
Начальная цена продажи объекта 177,87 руб. (сто семьдесят семь рублей восемьдесят семь копеек) с учетом НДС.
Сумма задатка – 18 руб. (восемнадцать рублей)

ЛОТ 2: право заключения договора аренды сроком 5 лет части помещения площадью 49,8 кв. м по адресу: г. Гродно, ул. Суворова, 76А. Размер ежемесячной арендной платы 20,17 базовой арендной величины. Условия проведения аукциона: целевое назначение арендуемых площадей – склад, производственное помещение, офис.
Начальная цена продажи объекта 210,41 руб. (двести десять рублей сорок одна копейка) с учетом НДС.
Сумма задатка – 21 руб. (двадцать один рубль)

**Продавец – УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» объединенная станция Гродно, 230023, г. Гродно, ул. Буденного, 37, тел. 8-0152-73-43-52, факс 8-0152-72-24-58**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия расчетов и заключения договора аренды:
- срок подписания договора аренды – 10 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона с представлением копии платежных документов перечисления суммы за право заключения договора аренды;
- срок оплаты – 7 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона (но до заключения договора аренды)

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 29 апреля 2020 г. в 14.00
по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:
г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208,
с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 23 апреля 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
https://grino.by/aukcion/**

---

В суд Октябрьского района г. Витебска поступило заявление о признании безвестно отсутствующей Стукалиной Юлии Игоревны, 25 июля 1982 года рождения, уроженки г. Витебска (и. н. 4250782E064PBO), зарегистрированной по адресу: г. Витебск, ул. Куйбышева, д. 139. Последнее известное место жительства: г. Витебск, пр-т Куйбышева, д. 139.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим какие-либо сведения о Стукалиной Юлии Игоревне, сообщить об этом в двухмесячный срок с момента публикации данного сообщения в суд Октябрьского района г. Витебска по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 34, (каб. 1.7, 2.10, 3.9), или по телефонам: 65 48 46, 65 48 36, 65 48 27.

---

В суд Октябрьского района г. Витебска поступило заявление о признании безвестно отсутствующей Лаппо Татьяны Васильевны, 16 марта 1983 года рождения, уроженки г. Витебска (и. н. 4160383E062PB7), зарегистрированной по адресу: г. Витебск, Московский пр-т, д. 66/1, кв. 43. Последнее известное место жительства: г. Витебск, ул. Титова, д. 80; последнее место пребывания — Республика Беларусь, г. Витебск.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим какие-либо сведения о Лаппо Татьяне Васильевне, сообщить об этом в двухмесячный срок с момента публикации данного сообщения в суд Октябрьского района г. Витебска по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 34, каб. 2.14, 1.7, или по тел.: 65 48 36, 65 48 50, 65 48 65.

---

белагропромбанк
www.belapb.by
позвони в свой банк 136

## Вниманию акционеров открытого акционерного общества «Белагропромбанк»

*Место нахождения общества: г. Минск, проспект Жукова, 3.*

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (далее – банк) сообщает, что согласно решению годового Общего собрания акционеров банка от 20 марта 2020 года, протокол № 1, с 15 мая 2020 года будет осуществляться выплата дивидендов по итогам работы банка за 2019 год по привилегированным акциям из расчета 0,03 руб. на одну акцию, по простым (обыкновенным) акциям из расчета 0,00214 руб. на одну акцию.

Список акционеров банка, имеющих право на получение дивидендов, сформирован на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 7 февраля 2020 года.

Выплата дивидендов акционерам банка осуществляется:

- юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь;

- физическим лицам в безналичном порядке в соответствии законодательством Республики Беларусь либо в установленном порядке наличными денежными средствами в ОАО «Белагропромбанк».

Дополнительную информацию можно получить по телефону:
(8017) 229 64 10.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2
от 13 февраля 2019 года выдана Национальным банком Республики Беларусь.
УНП 100693551

---

Центр Промышленной Оценки

**• Организация аукционов**

**• Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Минский завод игристых вин», г. Минск, ул. Радиальная, 50** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

Предмет электронных торгов
Месторасположение **– Минская обл., Пуховичский р-н, Блужский с/с, аг. Блужа, ул. Центральная, 54А**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Баня-прачечная** | здание специализированное для бытового обслуживания населения | 309,6 кв. м | 602/С-56802 |

Составные части и принадлежности: котельная, склад-пристройка

***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,1600** га, предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 02.04.2069) для обслуживания бани-прачечной. Ограничения (обременения): водоохранная зона р. Синявка, охранная зона электрич. сетей свыше 1000 В (пл. 0,0285 га)

**Начальная цена с НДС 20 % – 25 093,56 бел. руб.** (снижена на 50 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 15.01.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 22.04.2020 в 11.00. Окончание торгов: 22.04.2020 в 12.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов** |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 20.04.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06 E-mail: auction@cpo.by** |

---

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Вознесенский»

**Лот № 1:** здание неустановленного назначения, 141/С-14338, 126,3 кв.м, г.п. – 1990. **Адрес:** Брестская обл., Жабинковский р-н, Кривлянский с/с, д. Малые Яковчицы, ул. Центральная, 1А. **Начальная цена, бел. руб.** – 2 300,00 с НДС. **Задаток, бел. руб.** – 250,00. Шаг аукциона – 5 %. Земельный участок 122581005402000003 площадью 0,1983 га. Право аренды (по 19.09.2039). Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Размер штрафа в соответствии с соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона составляет 1 000,00 белорусских рублей

**Аукцион состоится 16.04.2020 в 11.00
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Продавец: ОАО «Вознесенский», 225126, Брестская обл., Жабинковский р-н, д. Вежки, ул. Центральная, д. 25, тел. 8 (01641) 43-1-10. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 9. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC BPSBBY2X, г. Минск. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 16.04.2020. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 7. Окончание приема заявлений: **14.04.2020 в 11.00.** Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 10.01.2020.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 13 апреля 2020 года повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

**Предмет торгов**

Технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники» с инв. № в ЕГРНИ 600/С-162566 общей площадью 9 270,6 кв. м (**назначение:** сооружение специализированное складов, хранилищ; **составные части и принадлежности:** технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники – литер А, состоящая из подъезда, трех покрытий, трех бортов, технологической площадки, дорожки, ограждения)

Сведения о земельном участке: площадь – 1,6243 га, кадастровый номер – 623650100001005212

Местонахождение – Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17

Начальная цена – 1 311 841,00 бел. руб. с учетом НДС

Сумма задатка – 131 000,00 бел. руб.

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», 220035, г. Минск, пр. Машерова, 80, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

